WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 СТУДЗЕНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 5
(26869)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗВЯЗДОЎСКІ ПРЫЗ — НА ПРАСПЕКТ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

Учора ў сценах рэдакцыі прайшоў традыцыйны розыгрыш прызоў сярод падпісчыкаў, якія аформілі падпісны купон на старэйшае беларускамоўнае выданне на першы квартал альбо 1-е паўгоддзе 2011 г.

Адразу адзначым, што сваіх новых гаспадароў каляровыя тэлевізары «Віцязь», кухонныя камбайны, электрачайнікі і мікрахвалевая печ знайшлі ў самых аддаленых кутках Беларусі. Як і раней, шчасліўчыкі былі вызначаны з дапамогай нашых гасцей. На гэты раз шмат каму фартуна ўсміхнулася дзякуючы лёгкай руцэ намесніка начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Алены ПРАКАПЕНІ (на фота злева) і супрацоўніцы РУП «Дом прэсы» Кацярыны КАЛЯНКОВАЙ.

Поўны спіс пераможцаў будзе змешчаны ў наступным нумары выдання. У якасці падказкі, паважаныя падпісчыкі, скажам, што адзін з прызоў трапіў чалавеку, які пражывае ў сталіцы на праспекце газеты «Звязда». Што называецца, у самую кропку.

**Кар. «Звязды».**

## ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ АТРЫМАЛА АД БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ ЎСЁ, ШТО БЫЛО ПАТРЭБНА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з планавай справаздачай старшыню праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб тым, што ўсе важнейшыя паказчыкі Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі за 2010 год выкананы. «Мы забяспечылі выкананне тых паказчыкаў, якія ў першую чаргу патрэбны для развіцця эканомікі. Гэта стабільны курс нацыянальнай валюты, стабільная сітуацыя на валютным рынку, паказчыкі па крэдытаванні эканомікі. Так, аб'ём выдадзеных крэдытаў з пачатку года павялічыўся на 40 працэнтаў», — сказаў Пётр Пракаповіч. Ён дадаў, што ў мінулым годзе эфектыўна рэалізоўвалася працэнтная палітыка, паспяхова працавала плацежная сістэма. «Гэта значыць эканоміка Беларусі атрымала ад банкаўскай сістэмы ўсё, што трэба рэальнаму сектару», — падкрэсліў кіраўнік Нацбанка.

Акрамя таго, былі зроблены пэўныя намаганні і для развіцця самой банкаўскай сістэмы. Забяспечана нарошчванне рэсурснай базы, уласнага капіталу банкаў, выкананне ўсіх нарматыўных паказчыкаў. Гэта стварае ўпэўненасць у тым, што і ў бягучым годзе ўсе запланаваныя паказчыкі банкаўскай сістэмай будуць выконвацца.

Пётр Пракаповіч выказаў упэўненасць і ў тым, што ў 2011 годзе Нацыянальны банк выканае паказчык па золатавалютных рэзервах. «У бягучым годзе ёсць усе магчымасці выканаць паказчык. Гэта звязана з тым, што ў нас значна лепшае будзе сальда знешняга гандлю, значна большы будзе прыток валюты ад экспарту тавараў і паслуг», — сказаў ён. У адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год золатавалютныя рэзервы Беларусі павінны ўзрасці не менш як на $1,2 млрд.

За 2010 год міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па методыцы МВФ, скараціліся на 11 працэнтаў да $5030,7 млн. Планавалася, што яны ўзрастуць на $0,5-1,83 млрд па стандартах МВФ. Кіраўнік Нацбанка растлумачыў, што прычынай невыкананне гэтага паказчыка стаў ажыятажны попыт насельніцтва на валюту, асабліва ў канцы года. «Цяпер яго ўжо няма. У мінулым годзе мы прадалі на чыстай аснове насельніцтву $1,5 млрд. Гэтыя грошы пайшлі з золатавалютных рэзерваў і яны фактычна ляжаць у насельніцтва дома, замест таго каб працаваць на рэспубліку, на эканоміку», — падкрэсліў Пётр Пракаповіч.

«Я хацеў бы параіць грамадзянам, якія захоўваюць грошы дома, няважна ў беларускіх рублях ці ў іншай валюце, прынесці іх у банк. Па-першае, там забяспечваецца захаванасць зберажэнняў, па-другое, налічваюцца працэнты. Тады гэтыя грошы будуць выкарыстоўвацца для эканомікі, для таго, каб наша жыццё палепшылася», — адзначыў кіраўнік Нацбанка. Ён нагадаў, што да канца 2015 года стаіць задача — выйсці на сярэдні ўзровень зарплаты не менш як Br3 млн. Гэта вельмі складаная задача, якая патрабуе намагання ўсіх грамадзян.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад Нацыянальнага банка выканання ўсіх паказчыкаў грашова-крэдытнай палітыкі ў бягучым годзе. Асаблівая ўвага павінна быць нададзена крэдытаванню рэальнага сектара эканомікі, выкананню параметраў, якія закладзены па працэнтнай палітыцы, і самае галоўнае — забяспечыць стабільную і эфектыўную работу банкаўскай сістэмы.

Пётр Пракаповіч запэўніў Прэзідэнта, што ўсе паказчыкі, закладзеныя ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2011 год, зацверджаныя адпаведным указам кіраўніка дзяржавы, будуць выкананы ў поўным аб'ёме.

Таксама на сустрэчы Аляксандру Лукашэнку было даложана аб выкананні шэрагу яго даручэнняў, у тым ліку аб ходзе работ па рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Прыпяцкае Палессе», аб прынятых мерах у рамках праграмы, а таксама аб перспектывах работы ў бягучым годзе.

Гэта праграма вельмі складаная, важная. Ад яе рэалізацыі многае будзе залежаць, таму кіраўнік дзяржавы трымае яе на асаблівым кантролі. Сем раёнаў Беларусі Брэсцкай і Гомельскай абласцей, якія прымыкаюць да ракі Прыпяць, у бягучай пяцігодцы атрымаюць абсалютна новае аблічча, тут будуць створаны ўсе неабходныя ўмовы для прыцягнення турыстаў, адпаведныя еўрапейскім стандартам.

Пётр Пракаповіч будзе штоквартальна дакладваць кіраўніку дзяржавы аб ходзе рэалізацыі гэтай праграмы.

## ПОЛУДЗЕНЬ У СТУДЭНЦКАЙ ВЁСЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**БРЫГАДА маляроў-аддзелачнікаў 66-га сталічнага будаўнічага ўпраўлення ў час абедзеннага перапынку. У гэтыя дні будаўнікі працуюць на адным з новых інтэрнатаў студэнцкай вёскі.**

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў 2010 ГОДЗЕ СКЛАЛА 9,9%

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні 2010 года ў параўнанні са снежнем 2009 года склаў у Беларусі 109,9%. У снежні інфляцыя склалася на ўзроўні 1%, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Такім чынам, у 2010 годзе Беларусь забяспечыла зніжэнне тэмпаў інфляцыі ў параўнанні з 2009 годам, калі яна дасягнула 10,1%. На 2010 год гэты паказчык быў запланаваны ў межах 8—10%. У 2011 годзе інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 7,5—8,5%. Гэта прадугледжана Асноўнымі накірункамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год.

Вадзім ГІГІН:

## «ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010 ГОДА ДАКАЗАЛІ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ»

Аб гэтым заявіў журналістам галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка», адказны сакратар Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін, перадае карэспандэнт **БЕЛТА**.

Палітолаг таксама адзначыў, што пры ацэнцы праведзенай кампаніі неабходна працаваць з афіцыйнымі звесткамі, якія агучыў ЦВК і прызналі розныя міжнародныя наглядальнікі, у тым ліку місія СНД. Вадзім Гігін падкрэсліў, што вельмі сумна бачыць сітуацыю, калі людзі, у тым ліку прадстаўнікі кіраўніцтва замежных дзяржаў, апіраюцца на галаслоўную і нічым не пацверджаную інфармацыю. Такія звесткі нішто іншае, як элемент прапаганды.

Масавая несанкцыянаваная акцыя, якая прайшла ў Мінску 19 снежня 2010 года, была арганізавана намнога горш, чым аналагічныя «плошчы» 2001 і 2006 гадоў. Палітолаг нагадаў, што мінулыя выступленні былі больш масавыя і вынік быў іншы. Так, у 2001 годзе пратэстуючым нават на час удалося захапіць будынак ДК прафсаюзаў. У 2006 годзе была зроблена спроба штурму ізалятара часовага ўтрымання на Акрэсціна. Акрамя таго, некалькі дзён на Кастрычніцкай плошчы стаяў невялікі палатачны гарадок. Аналізуючы масавую несанкцыянаваную акцыю 19 снежня, Вадзім Гігін адзначыў, што гэта магла быць спроба дзяржаўнага перавароту. Палітолаг нагадаў, што мінулыя выступленні былі больш масавыя і вынік быў іншы. Так, у 2001 годзе пратэстуючым нават на час удалося захапіць будынак ДК прафсаюзаў. У 2006 годзе была зроблена спроба штурму ізалятара часовага ўтрымання на Акрэсціна. Акрамя таго, некалькі дзён на Кастрычніцкай плошчы стаяў невялікі палатачны гарадок. Аналізуючы масавую несанкцыянаваную акцыю 19 снежня, Вадзім Гігін адзначыў, што гэта магла быць спроба дзяржаўнага перавароту. Палітолаг таксама імітацыя перавароту для апраўдання перад замежнымі спонсарамі. Гаворачы аб колькасці ўдзельнікаў, палітолаг адзначыў, што, хутчэй за ўсё, у час акцыі яна не была пастаяннай. Яна вар'іравалася ад 3-4 тысяч да 10-11 тысяч. Пры гэтым звесткі некаторых СМІ відавочна разыходзяцца з рэальнасцю: калі нямецкі часопіс «Шпігель» даў даволі аб'ектыўную ацэнку (10 тыс.), то некаторыя расійскія тэлеканалы яўна перабольшвалі, гаворачы пра 50 тыс. чалавек. У любым выпадку колькасць асоб, якія сабраліся на плошчы, зусім не сведчыць аб росце настрою пратэсту ў Беларусі.

Закранаючы тэму збівання журналістаў на плошчы 19 снежня, Вадзім Гігін заклікаў разбірацца асобна ў кожным канкрэтным выпадку, а не абвінавачваць у цэлым нейкі адзін бок.

Таксама Вадзім Гігін адзначыў, што ў Мінску пражываюць амаль 450 тыс. маладых людзей. Відавочна, што ў несанкцыянаваных акцыях удзельнічае далёка не самая вялікая іх частка. Як адзначыў палітолаг, у нашым грамадстве 2/3 моладзі наогул апалітычныя. На яго думку, гэта нармальны паказчык. Калі палітызацыя ў маладзёжным асяроддзі ўзрасце, гэта нездаровая прыкмета. У любым выпадку, на думку палітолага, беларуская апазіцыя пацярпела няўдачу яшчэ і таму, што не скарысталася магчымасцю добра падрыхтавацца да парламенцкіх выбараў 2012 года. Прэзідэнцкая кампанія давала такі шанс. У прыватнасці, апазіцыянерам можна было выкарыстаць тых лідараў, якія мелі высокі статус кандыдатаў у Прэзідэнты. Замест гэтага ў Беларусі пачала адбывацца радыкалізацыя часткі апазіцыі. «Гэта праблема не толькі самой апазіцыі, але і ўсяго грамадства, і яе трэба вырашаць разам», — рэзюмаваў Вадзім Гігін.

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

Ва Урадзе

## «У НАШАЙ КРАІНЕ НЕ БУДЗЕ МАСАВЫХ ЗВАЛЬНЕННЯЎ, УСПЛЁСКУ БЕСПРАЦОЎЯ»

*У гэтым годзе на прафпадрыхтоўку плануецца накіраваць 25 тысяч беспрацоўных*

**БЕЛАРУСЬ забяспечвае дастаткова высокую занятасць насельніцтва, зазначыў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаўся праект Дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва краіны на гэты год, прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. Кіраўнік урада патлумачыў, што нават у разгар сусветнага фінансавага крызісу ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў рэспубліцы складае ўсяго 0,7 працэнта да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва, у той час як, напрыклад, у Вялікабрытаніі гэты паказчык роўны 7,9 працэнта, у Польшчы — 9,4, у Літве — 13, Расіі — 9,2 працэнта.**

Паводле слоў прэм'ера, забеспячэнне занятасці і сацыяльнай абароны людзей — адна з галоўных задач органаў улады. «І я ўпэўнены, — дадаў ён, — што ў нашай краіне не будзе масавых звальненняў, усплёску беспрацоўя». Таксама Міхаіл Мясніковіч акцэнтаваў увагу на тым, што дзяржава павінна не проста клапаціцца пра занятасць, — ёй неабходна думаць пра занятасць высокапрадукцыйнай працай. Гэта значыць, нароўні з колькаснымі паказчыкамі забяспечваць і якасныя. У прыватнасці, размова ідзе пра неабходнасць павелічэння прадукцыйнасці працы. «У нашых планах, — заявіў кіраўнік урада, — павелічэнне прадукцыйнасці працы ў 1,6 раза без зніжэння колькасці занятых у эканоміцы».

Перш чым агучыць асноўныя палажэнні праекта новай праграмы, міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна падкрэсліла, што пастаўленыя на 2010 год задачы ў сферы занятасці арыенціровачна выкананы, усе вобласці краіны, рэгіёны і малыя гарады выйшлі на прагнозныя паказчыкі. Зыходзячы ж з таго, што новая пяцігодка накіравана на мадэрнізацыю, асноўнай мэтай новай праграмы садзейнічання занятасці насельніцтва з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў і канкурэнтаздольнасці працоўнай сілы на рынку працы. Сёлета мяркуецца стварыць 175 тысяч новых працоўных месцаў, у тым ліку ў малых гарадах — 24,1 тысячы, у сельскай мясцовасці — 16,7 тысячы. Марыяна Шчоткіна паведаміла, што сёлета павялічана колькасць субсідый, якія будуць выдавацца беспрацоўным з тым, каб аказаць садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы паслуг, аграэкатурызму і г.д. Пры гэтым прадугледжваецца дадатковае стымуляванне беспрацоўных, якія арганізуюць прадпрымальніцкую дзейнасць па ўкараненні навуковых даследаванняў і распрацовак: ім будзе павялічаны памер субсідый на адкрыццё ўласнай справы.

СТАР. 2

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ТАРЫФ «ЗА РУЛЁМ: ШТРАФ 70 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

**З 12 студзеня ўступаюць у сілу змены ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Пра найбольш актуальныя з іх «Звязде» распавялі ў ДАІ МУС Беларусі.**

За парушэнне правілаў прыпынку ці стаянкі транспартнага сродку, згодна з новым заканадаўствам, давядзецца заплаціць 1 базавую велічыню (1 базавая на сёння складае 35 тысяч беларускіх рублёў. — **Аўт.**). Штраф за паўторнае парушэнне на працягу года складзе ўжо 2 базавыя велічыні. У тым выпадку, калі правілы прыпынку ці стаянкі парушыць кіроўца грузавога аўтамабіля масай больш як 3,5 тоны, то яго папросяць заплаціць штраф у памеры 5 базавых велічыняў, паўторнае ж парушэнне на працягу года абыдзецца ў 10 базавых.

Калі кіроўца ці яго пасажыры не будуць прышпіленыя рамянямі бяспекі, то інспектар мае поўнае права аштрафаваць на суму да 1 базавай велічыні, за паўторнае парушэнне на працягу года штраф складзе ад 2 да 5 базавых.

Штраф за размову па тэлефоне падчас кіравання аўтамабілем для кіроўцы прадугледжаны ў памеры да 2 базавых велічыняў. Калі такое парушэнне здзейсніце паўторна на працягу года, давядзецца развітацца са значна большай сумай — ад 2 да 8 базавых велічыняў.

**Надзея ДРЫЛА.**

### РОЗНІЧНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАРЭЛКУ Ў БЕЛАРУСІ З 12 СТУДЗЕНЯ ПАВЫШАЮЦЦА НА 5 ПРАЦЭНТАЎ

**Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі ад 3 студзеня 2011 года № 1 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 18 жніўня 2010 г. № 126», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Мінэканомікі.**

Змяненне цэн звязана з ростам ставак акцызнага падатку на алкагольную прадукцыю і з улікам прапанаў канцэрна «Белдзяржхарчпрам». Такім чынам, пастановай прадугледжана павышэнне на 5 працэнтаў рознічных цэн на гарэлку, мінімальных адпускных цэн на алкагольную прадукцыю мацункам звыш 28 працэнтаў і адпускных цэн на спірт этылавы з харчовай сыравіны. Рознічная цана на гарэлку са спірту «Люкс» мацункам 40 працэнтаў складзе Br8650 за 0,5 л без кошту посуду.

### БЕЛАРУСЬ ЗАБАРАНІЛА ЎВОЗ СВІНІНЫ З ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВОБЛАСЦІ РАСІІ

**Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ветэрынарыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Іван Смільгінь.**

Увядзенне забароны на неабмежаваны тэрмін абумоўлена распаўсюджваннем афрыканскай чумы свіней у вобласці. Спецыялісты растлумачыў, што абмежаванні на ўвоз у Беларусь датычацца жывых свіней, спермы кныроў, мяса і мясапрадуктаў і сыравіны са свінін, кармоў і кармавых дабавак жывёльнага і раслінная паходжання...

### ЗАБАРАНЕНЫ ЎВОЗ КАРМОЎ І ПРАДУКЦЫІ ЖЫВЁЛЬНАГА ПАХОДЖАННЯ З ГЕРМАНІІ

**Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення ветэрынарыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Юрый Піваварчык.**

Увядзенне забароны звязана з выяўленнем павышанай колькасці дыяксіну ў кармах для жывёл у Германіі. Дыяксін аказвае тэратагеннае, мутагеннае і канцэрагеннае дзеянне. Гэта здавітае рэчыва можа выклікаць шэраг цяжкіх заворванняў, такіх як рак, мужчынская і жаночая бясплоднасць. Кармы, якія змяшчаюць павышаную колькасць дыяксіну, былі выяўлены ў Нідэрланды, у Шлезвіг-Гольштэйне, Паўночным Рэйне-Вестфаліі, Саксоніі-Ангальце і Цюрынгіі.

Забарона на ўвоз прадукцыі з Германіі прадоўжыцца да таго часу, пакуль ва ўсіх пацярпелых рэгіёнах сітуацыя не стабілізуецца.

Што датычыцца іншых краін ЕС, куды магла ўвозіцца заражаная прадукцыя, забарону на ўвоз прадукцыі з іх уводзіць у Беларусі не плануецца. «У цэлым імпарт такіх тавараў з Еўропы ў рэспубліку нязначны», — падкрэсліў Юрый Піваварчык.

### ВЫЗВАЛІЛІ РУКУ З «ПАЛОНУ» ЗА 13 ХВІЛІН

**Маладзечанскім выратавальнікам паведамілі пра няшчасны выпадак на ААТ «Маладзечанскі малочны камбінат» — руку чалавека зацісnула ў шнэк.**

На месцы было выяўлена, што ў адным з цэхаў слесар-рамонтнік вырашыў выправіць непаладку ў агрэгаце па ахаладжэнні тварагу, не спыняючы шнэк. У выніку руку зацягнула ў агрэгат і для дапамогі спатрэбіўся аварыйна-выратавальны інструмент. Выратавальнікі раскруцілі балты кажуха, дамкратам паднялі шнэк, зрэзалі балты бензарэзам і — вызвалілі руку. З моманту выкліку да вызвалення пацярпелага з «палону» прайшло 13 хвілін. Мужчына шпіталізаваны ў траўматалагічнае аддзяленне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МІЛЬЁНЫ ЗНІКЛІ Ў ДЗІРАВЫМ ДАХУ

**Старшыня СВК, які пражывае ў в. Дварэц Лунінецкага раёна, пералічыў індывідуальнаму прадпрымальніку з гэтай жа вёскі 70 млн. рублёў, каб той зрабіў рамонт даху жывёлагадоўчага комплексу СВК «Чучэвічы».**

Прадпрымальнік нічога не рабіў, але старшыня акт здачы-прыёму работы падпісаў, і прадпрымальніку былі пералічаны тыя мільёны.

Праводзяцца вобыскі, а нанесеныя страты вярнулі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАЦВЕРДЗІЎ РАШЭННЕ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАГРАНІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАГРАНБЯСПЕКІ Ў 2011 ГОДЗЕ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 11 студзеня зацвердзіў Рашэнне на правядзенне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнне пагранічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у 2011 годзе.

«Я гатовы выслухаць асноўныя палажэнні, асабліваці цяперашняй сітуацыі вакол Беларусі і тое, што мы павінны зрабіць не толькі па лініі аховы дзяржграніцы, але і ў цэлым у дзяржаве, каб забяспечыць спакойнае жыццё нашых людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігар Рачкоўскі, на 2011 год сфарміраваны прыярытэтныя задачы і напрамкі развіцця органаў пагранслужбы Беларусі.

Першая задача — удасканаленне сістэмы правядзення дзяржаўнай пагранічнай палітыкі. «Рэформы ў нас прайшлі эвалюцыйна, а таму на сённяшні дзень няма патрэбнасці ў змяненні штатных структур. Ідзе працэс удасканалення і шліфоўкі гэтага механізма», — адзначыў Ігар Рачкоўскі.

Другой прыярытэтнай задачай з'яўляецца актыўнае процідзеянне арганізаванай злачыннасці ва ўзаемадзеянні з пагранічнікамі сумежных дзяржаў.

Трэцяя задача — інтэграванае кіраванне аховай граніцы, што прадугледжвае актыўнае ўкараненне сучасных тэхналогій.

Адным з важных напрамкаў, перш за ўсё для грамадзян Беларусі, таксама з'яўляецца забеспячэнне функцыянавання двухбаковых дагавораў з урадамі Польшчы, Літвы і Латвіі аб малым прыгранічным руху.

У гэтым пытанні неабходна, з аднаго боку, забяспечыць спрашчэнне працэдур і камфортнае перасячэнне граніцы, а з другога — гарантаваць пагранічную бяспеку краіны.

У параўнанні з 2009 годам пасажырапаток праз граніцу Беларусі ўзрос у 2010 годзе на 15,5 працэнта і склаў рэкордныя 26,4 млн чалавек (рост прыкладна на 4 млн). Праз беларускую граніцу ў 2010 годзе было прапушчана каля 10 млн транспартных сродкаў, што на 27 працэнтаў больш, чым у 2009 годзе. З агульнай лічбы пасажырапатоку больш як 11 млн складаюць замежныя грамадзяне. З іх транзітам праз рэспубліку перамяшчаліся амаль 1,4 млн чалавек.

Акрамя таго, у 2010 годзе авіяцыйныя пункты пропуску краіны па пасажырапатоку пераадолелі рубеж 1 млн чалавек (амаль 1 млн 130 тыс. грамадзян па выніках года). Прагназуецца, што кожны год пасажырапаток праз авіяцыйныя пункты пропуску Беларусі будзе павялічвацца на 25 працэнтаў.

У 2010 годзе беларускія пагранічнікі канфіскавалі кантрабанды на суму каля Br41,1 млрд, у той час як па выніках 2009 года гэта лічба складала Br34,5 млрд. У чатыры разы больш затрымана наркатычных сродкаў: звыш 73,5 кг наркотыкаў і каля 21 кг псіхатропных рэчываў. Пагранічнікі затрымалі 70,5 кг узрыўчаткі, каля 5 кг ядавітых і атрутных рэчываў, каля 2 тыс. боепрыпасаў і 102 адзінкі зброі.

Колькасць парушэнняў дзяржграніцы скарацілася на 11 працэнтаў (з 635 да 564). На тэрыторыі краіны за парушэнне правіл знаходжання і транзітнага праезду затрымана амаль 10,5 тыс. замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. Акрамя таго, затрымана амаль 100 незаконных мігрантаў, з якіх амаль 70 — непасрэдна на дзяржграніцы. У той жа час на 14 працэнтаў (з 28 тыс. да 32,5 тыс.) павялічылася колькасць пропускаў, выдадзеных для наведвання пагранічнай зоны і пагранічнай паласы.

У 2010 годзе прадоўжыла актыўна развівацца міжнароднае супрацоўніцтва Дзяржпагранкамітэта. Цяпер у сферы процідзеяння незаконнаму абароту ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў Беларусь сумесна з Японіяй і Еўракамісіяй рэалізуе два праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі агульным коштам каля $2,4 млн.

Акрамя таго, сумесна з пагранічнай службай ФСБ Расіі рэалізуецца Праграма ўладкавання знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы, разлічаная на 2007—2011 гады. У гэтым годзе таксама прадоўжыцца рэалізацыя дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы ўладкавання беларуска-ўкраінскага ўчастка граніцы і мадэрнізацыі польскага ўчастка. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база органаў пагранслужбы. Напрыклад, у іх распараджэнне ў мінулым годзе паступіла некалькі новых верталётаў.

Агульная працягласць беларускай граніцы складае 3 тыс. 617,5 км. З іх пад аховай пагранічнікаў знаходзіцца 2334,5 км (173 км граніцы з Латвіяй, 679 км — з Літвой, 398,5 км — з Польшчай і 1084 км — з Украінай). Усяго на сёння на граніцы Беларусі функцыянуе 68 пунктаў пропуску. Ахову рубяжоў краіны забяспечваюць амаль 14 тыс. пагранічнікаў.

**БЕЛТА.**

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 017,00 | 1 чэшская крона | 159,27 | USD | 30,6252 |
| ▲ 1 еўра | 3 901,28 | 1 польскі злоты | 1 004,46 | 10 UAH | 38,4497 |
| 1 латвійскі лат | 5 572,07 | ▼ 1 расійскі рубель | 98,51 | 1000 BYR | 10,1542 |
| 1 літоўскі літ | 1 131,02 | 1 украінская грыўня | 378,52 | EUR | 39,6076 |

## У МАСАВАЙ ГІБЕЛІ ПТУШАК У БОЛЬШАСЦІ ВЫПАДКАЎ ВІНАВАТЫЯ ЛЮДЗІ

**Умінулы панядзелак арнітолагамі быў зафіксаваны чарговы выпадак невытлумачальнай масавай гібелі шпакоў у турэцкай правінцыі Бурса. Там, на дарозе каля мястэчка Караджабей ляжалі дзясяткі мёртвых птушак. Мясцовыя ўлады распачалі расследаванне; робяцца неабходныя аналізы, аднак прычына гібелі птушак пакуль невядомая.**

Першыя паведамленні аб загадкавай масавай гібелі птушак пачаліся ў апошні дзень мінулага года, калі на амерыканскі горад Бібі ў штаце Арканзас з неба зваліліся каля трох тысяч драздоў і іншых крылатых. Праз некалькі дзён падобныя выпадкі адбыліся ў штатах Луізіяна і Кентукі. Амерыканскія спецыялісты мяркуюць, што крылатыя загінулі ад уздзеяння навагодніх феерверкаў і моцнага ветру.

Ужо ў пятніцу 7 студзеня на поўначы Італіі было знойдзена каля 400 мёртвых птушак. Загінулыя туркаўкі ляжалі ўздоўж дарог каля хімічнага завода. Мясцовыя арнітолагі не выключаюць магчымасці хімічнага атручвання ці інфекцыйнага захворвання. Выпадкі масавай гібелі галубоў, шпакоў і драздоў былі зафіксаваны днямі ў Швецыі і Канадзе.

**Спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН** адзначыў, што кожны выпадак масавай гібелі птушак трэба разглядаць асобна і вывучаць скрупулёзна, бо менавіта крылатыя лічацца індыкатарамі стану навакольнага асяроддзя. Спецыяліст адзначыў, што на тэрыторыі Беларусі летась і ў першыя дні гэтага года масавай гібелі птушак не было.

Руслан Шайкін узгадаў выпадак каля 2 гадоў таму побач з населеным пунктам Старыя Дарогі Мінскай вобласці, калі амаль імгненна загінула каля дзесяці амялушак. Там чарада птушак ляцела харчавацца на рабіны побач з будынкам, у якім шкло акон «спрацавала» як люстэрка. Амялушкі паляцелі не ў той бок і разбіліся аб шкло. Падобная сітуацыя з амялушкамі была ў тую зіму і ў Брэсце.

Рэгулярна ў перыяд міграцыі ўвесну і восенню гінуць птушкі каля аўтамабільных трас у тых месцах, дзе зроблены празрыстыя гукаізаляцыйныя шчыты. Птушкі пералятаюць цераз дарогу даволі хутка і ўдараюцца ў празрыстую перашкоду. Каб пазбегнуць такіх выпадкаў, спецыялісты АПБ рэкамендуюць маляваць на шчытах цёмныя сілуэты небяспечных драпежных птушак.

Руслан Шайкін упэўнены, што амаль усе выпадкі масавай гібелі птушак звязаны з дзейнасцю чалавека.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**На фота:** *гукаізаляцыйныя шчыты на Слуцкай шашы часам спыняюць птушак... назаўсёды.*

# «У НАШАЙ КРАІНЕ НЕ БУДЗЕ МАСАВЫХ ЗВАЛЬНЕННЯЎ, УСПЛЁСКУ БЕСПРАЦОЎЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб павысіць канкурэнтаздольнасць працоўнай сілы, у гэтым годзе на прафпадрыхтоўку плануецца накіраваць 25 тысяч беспрацоўных, прычым 45 працэнтаў — па заняткаў наймальнікаў. Зыходзячы з патрэб рынку, таксама ўнесены змены ў пералік прафесій: павялічаны аб'ём падрыхтоўкі спецыялістаў будаўнічага профілю. Такія спецыяльнасці цяпер інтэграваныя — маляр-тынкоўшчык, абліцоўшчык-плітачнік і г.д. Адначасова амаль у 2,5 раза зменшаны аб'ём падрыхтоўкі па прафесіях, якія сёння ўжо не карыстаюцца попытам. У лік апошніх спецыяльнасцяў трапілі, напрыклад, сакратары-рэферэнты.

Калі летась асноўны ўпор рабіўся на вырашэнні праблем, звязаных з няпоўнай занятасцю на вытворчасці, захаваннем працоўных месцаў і працоўных калектываў, то задача гэтага года, зазначыла Марыяна Шчоткіна, — забяспечыць людзей працай ва ўмовах мадэрнізацыі, а таксама заняць грамадзян, якія не здольныя на роўных умовах канкураваць на рынку працы. З улікам гэтага перамяшчаюцца прыярытэты палітыкі занятасці — ад штучнага захавання працоўных месцаў у бок павышэння эканамічнай эфектыўнасці занятасці. У праекце праграмы з'явіліся новыя раздзелы, галоўны з якіх — садзейнічанне наймальнікам у мадэрнізацыі эканомікі. Закладзены ў праграму і прэвентыўныя захады, накіраваныя на зніжэнне сацыяльных выдаткаў, якія будуць звязаны з мадэрнізацыяй і абнаўленнем працоўных месцаў — у першую чаргу, праз удасканаленне заканадаўства ў сферы занятасці. Так, прадугледжаны шэраг дапаўненняў і змяненняў у дзейнае заканадаўства ў сферы занятасці і сацыяльнай абароны. У прыватнасці, прадугледжваецца павелічэнне памераў дапамогі пры накіраванні на перанавучанне беспрацоўных з ліку тых, хто страціў працу ў выніку мадэрнізацыі.

Як і раней, асаблівая ўвага нададзена забеспячэнню занятасці грамадзян мэтавых груп, у першую чаргу, інвалідаў, моладзі. І ўпершыню замацаваныя гарантыі для тых, хто вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі. Забяспечаныя ў поўным аб'ёме заяўкі грамадскіх арганізацый інвалідаў па выдзяленні грошай на стварэнне працоўных месцаў для гэтай катэгорыі: на такія мэты пойдзе больш за 8 мільярдаў рублёў. Наймальнікам устаноўлена броня для прыёму на працу амаль 2 тысяч інвалідаў. Таксама будзе ўзмоцнена сацыяльная падтрымка беспрацоўных з ліку інвалідаў у перыяд прафесійнага навучання.

Марыяна Шчоткіна паведаміла і пра тое, што заканадаўча будзе пашырана магчымасць для атрымання першай прафесіі непасрэдна на вытворчасці, што «вельмі важна для моладзі». Каб павысіць прэстыж рабочых прафесій, у краіне прадугледжваецца ўдасканальваць прафарыентацыйную працу, асабліва з выпускнікамі школ пры выбары імі далейшага шляху. Як мяркуецца, у першым паўгоддзі будуць падрыхтаваныя прапановы па новай канцэпцыі прафарыентацыі моладзі.

Праца ў сельскай мясцовасці і малых гарадах таксама будзе прыярытэтным напрамкам праграмы. Паводле меркавання міністра, урад у свой час выбраў правільную тактыку ў адносінах паэтапнага рашэння праблем занятасці ў найбольш крытычных малых гарадах. Для таго, каб замацаваць станоўчыя вынікі ў малых гарадах, якія маюць патрэбу ў асаблівай падтрымцы, у новую праграму ўключана 27 малых гарадоў, з якіх 16 былі ў леташняй праграме. Крытэрыямі адбору сталі ўзровень і дынаміка напружанасці на рынку працы, дынаміка ўзроўню беспрацоўя і колькасці беспрацоўных і інш. Акрамя таго, пад асаблівым кантролем будуць знаходзіцца яшчэ 7 раёнаў, уключаных у Праграму развіцця Прыпяцкага Палесся.

На рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы плануецца выкарыстаць без уліку сродкаў наймальнікаў 155,8 мільярда рублёў, а ў цэлым — 171,2 мільярда.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## З МОСТА НА ЧЫГУНКУ ПЕРАКУЛІЎСЯ «МЕРСЕДЭС-БЭНЦ»

Здарэнне адбылося бліжэй да вечара, калі 40-гадовы кіроўца рухаўся па месце праз чыгунку ў кірунку вуліцы Ільіча ў Гомелі. Раптам ён выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе па датычнай сутыкнуўся з аўтамабілем «Мазда». Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ДАІ, пасля гэтага мужчына не справіўся з кіраваннем і наехаў на бардзюр, затым — на асвятляльную апору, а потым — і на парэнчы моста. Разбурыўшы іх, аўтамабіль зваліўся ў непасрэднай блізкасці ад чыгуначнага пуці. У выніку здарэння вадзіцель і пасажыр аўтамабіля «Мерседэс-Бэнц» атрымалі цялесныя пашкоджанні і знаходзяцца ў бальніцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ДЗЕД МАРОЗ У ПАТРУЛЬНЫМ «КРАЙСЛЕРЫ»

**На калядную дабрачынную акцыю ў Ліду супрацоўнікі Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі прыехалі на патрульных «Крайслерах», прычым некаторыя былі апранутыя ў касцюмы Дзеда Мароза і казачных персанажаў.**

Гэта акцыя недарэмна называлася «Мары збываюцца», бо на «Крайслерах» змаглі праехацца ўсе ахвотныя выхаванцы дзіцячага дома змешанага тыпу і сацыяльна-педагагічнага цэнтра. Пры гэтым цікавае спалучалася з карысным. У прыватнасці, сярод падарункаў былі святловяртальныя павязкі, а акцёры раённага Палаца культуры выступілі з праграмай па Правілах дарожнага руху.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## АЎТАСТРАХОЎКА ПРЫ ПАДАРОЖЖЫ Ў ВІЛЬНЮС — БЕЗ АНІЯКІХ ІЛЬГОТ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**У нашай даўняй чытачкі Людмілы Ігнацьеўны Пажыдаевай з вёскі Паляны Ашмянскага раёна сын, нявестка і ўнукі жывуць у Вільнюсе. Нядаўна на ўласным аўтатранспарце яна разам з мужам наведвала іх там. І вось пасля гэтага падарожжа да дзяцей у Людмілы Ігнацьеўны ўзнікла пытанне.**

— Каб патрапіць у Літву, на мяжы трэба аформіць абавязковую страхоўку на транспартны сродак. Каштуе яна 30 еўра на два тыдні. Але нам на такі час страхоўка не патрэбная. Калісьці, у часы так званых «чаўнакоў», ад такога працяглага тэрміну, магчыма, і было б добра. А зараз... Мы пабылі ў гасцях тры дні, і нам дастаткова. У той жа час і я, і муж — пенсіянеры. Для нас такая сума аплаты за страхоўку — некалькі накладная. Дык чаму б не зрабіць плату за абавязковую страхоўку аўтатранспартнага сродку дыферэнцаванай, напрыклад, каму патрэбна — толькі за тры дні знаходжання за мяжой? — пыталася заяўніца. — Тым больш, як расказваў нам сын, у сябе ў Вільнюсе ён можа так зрабіць.

Па каментарый мы звярнуліся ў **Белдзяржстрах**. Вось што нам паведамілі **спецыялісты аддзела развіцця страхавання ўпраўлення транспартнага страхавання.**

— Пытанні «зялёнай карты» — абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў аўтатранспартных сродкаў за межамі Рэспублікі Беларусь — рэгламентуюцца Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 530 і № 531 ад 25 жніўня 2006 года. Апошнім, у прыватнасці, даюцца тарыфы. «Зялёная карта» распаўсюджваецца на Літву, як і на іншыя краіны Еўропы. У пункце 134 Указа № 530 сказана, што мінімальны тэрмін страхавання — 15 сутак або 360 гадзін. Аплата складае 30 еўра і ўносіцца толькі ў валюце, — распавялі нам. — Ніякіх іншых тэрмінаў, як і памераў аплаты за страхоўку, або якіх ільгот ці прэферэнцый у згаданым кантэксце для грамадзян не прадугледжана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШКОДА МУЖУ І АЎТАМАБІЛЯМ

9 студзеня ў 23 гадзіны ў Крычаве брыгада хуткай медыцынскай дапамогі даставіла нецвярозага 51-гадовага мужчыну з раненнем у грудзі. Міліцыя хутка ўстанавіла, што гэтым вечарам муж з жонкай пасварыліся пасля сумеснага распіцця спіртнога. Пры гэтым апошнім жаночым аргументам стаў нож. Жонка, равесніца пацярпелага мужа, затрымана за ўчыненне цяжкага цялеснага пашкоджання.

Калі ў гэтым выпадку раздражнёнасць, відаць, выклікала прыстойная доза алкаголю, то што стала прычынай здарэння, якое адбылося ў Горках нядзельным вечарам, яшчэ трэба разабрацца. Сем жыхароў горада з вуліцы Будаўнікоў звярнуліся ў міліцыю з заявамі, што невядомы зламыснік пашкодзіў 14 шын у іх аўтамабілях, прыпаркаваных каля дамоў № 5 і 9.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ПРЫГОЖА, АЛЕ НЕБЯСПЕЧНА

**У Магілёве змагаюцца з ледзяшамі, якія з адлігай навіслі з дахаў дамоў над тратуарамі і дарогамі.**

Над ліквідацыяй ледзяшоў і снежных напластаванняў працуе з дзясятак аўтавышак, задзейнічана больш за паўсотні чалавек. Дамы, куды тэхніка яшчэ не дабралася, агароджваюцца спецыяльнай стужкай. Каб людзі ведалі, што не толькі цяжкі ледзяш, але і любы снежны ком, які ляціць з даху, уяўляе сабой сур'ёзную пагрозу і людзям, і прыпаркаваным паблізу аўтамабілям.

**Ілона ІВАНОВА.**

Фота Леаніда ШЧАГЛОВА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЧАРГОВЫЯ АКЦЫІ ПРАТЭСТУ ПРАХОДЗЯЦЬ У АФІНАХ

**Транспартнікі выступілі супраць планаў рэарганізацыі транспартных кампаній. Учора на некалькі гадзін у горадзе перасталі хадзіць аўтобусы, тралейбусы і трамваі. Не працавала як звычайнае, і лёгкае наземнае метро.**

Спыняцца на гэтым транспартнікі не збіраюцца. Напярэдадні, 10 студзеня, страйкоўцы правялі ў афінскай гасцініцы агульны сход, на якім абмеркавалі прызначаныя на 11 і 12 студзеня кароткатэрміновыя страйкі, а таксама 24-гадзінную акцыю пратэсту 13 студзеня.

У адказ кіраўніцтва транспартных кампаній плануе звярнуцца ў суд для таго, каб абвясціць страйкавы тыдзень незаконным. Да таго ж галіновы міністр Дзімітрыс Рэпас ужо заявіў, што праграма рэфармавання транспартных кампаній будзе ажыццяўляцца насуперак пратэстам.

Прафсаюзы выступаюць супраць планаў урада радыкальна перагледзець структуру грамадскага транспарту ў Афінах, штогадовы дэфіцыт бюджэту якога перавышае 500 млн. еўра. Плануецца аб'яднаць усе наяўныя транспартныя кампаніі ў дзве — адну для рэйкавых відаў (метро, лёгкае наземнае метро і трамвай) і другую — для аўтобусаў і тралейбусаў. Таксама мяркуецца скараціць з 75% да 40% дзяржаўную субсідыю кошту квітка, які каштуе 1 еўра і дзейнічае на працягу 1,5 гадзіны.

### У ВЫНІКУ ПАВОДКІ Ў ФРГ ЗАГІНУЛІ ЧАТЫРЫ ЧАЛАВЕКІ



**Як мінімум, чатыры чалавекі загінулі ў Германіі ў выніку магутнай паводкі, выкліканай дажджамі і раставаннем снегу, паведамляе Agence France-Presse.**

У мінулыя выхадныя ў Ніжняй Саксоніі патануў мужчына пасля таго, як яго каноэ перакулілася. Другі мужчына загінуў, сплаўляючыся на сваім каяку ў раёне Пфорцхайма, што побач са Штутгартам.

Акрамя таго, у суботу, 8 студзеня, відавочцы паведамілі, што заўважылі труп у рацэ недалёка ад Вайблінгена. Паліцыя пакуль не знайшла цела, аднак падазрае, што гаворка ідзе пра загінулага бяздомнага, які пражываў у раёне.

У панядзелак кіроўца машыны паспрабаваў праехаць праз зачынены для руху мост і быў у выніку змыты разам з аўтамабілем. Пустую машыну знайшлі пазней. Сам кіроўца патануў. Нагадаем, што мацней за іншых ад паводкі пацярпелі паўднёва-заходнія раёны Германіі. Найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў Рэйнланд-Пфальцы, дзе пад водой апынуліся каля 30 населеных пунктаў. Таксама затоплены Кобленц, размешчаны на месцы ўпадзення Мозеля ў Рэйн.

### ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ ПРАЦЯГНЕЦЦА ТЫСЯЧУ ГАДОЎ

**Узмацненне глабальнага пацяплення клімату не спыніцца прынамсі найбліжэйшую тысячу гадоў. Павярнуць працэс назад не зможа нават поўная забарона на выкіды парніковых газаў у атмасферу. Да такой высновы прыйшлі канадскія навукоўцы з Універсітэта Калгары, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Паводле мадэлі навукоўцаў Паўночнае і Паўднёвае паўшар'і Зямлі прыкметна адрозніваюцца па ўспрымальнасці да пацяплення. Так, у Паўночным паўшар'і да канца трэцяга тысячагоддзя будзе назіравацца павольнае вяртанне клімату да зыходных параметраў, тады як клімат Паўднёвага паўшар'я будзе рэагаваць на змены канцэнтрацыі вуглякіслага газу ў паветры з вялікай затрымкай. Такія адрозненні адмыслоўцы тлумачаць павольным змешваннем вод паўночнай часткі Атлантычнага акіяна з паўднёвымі водамі Атлантыкі.

У выніку такія рэгіёны планеты, як тэрыторыя сучаснай Канады, могуць да 3000 года ў значнай ступені вярнуцца да сучасных кліматычных параметраў, тады як у Паўднёвым паўшар'і будзе назіравацца сталае нарастанне сярэднегадавых тэмператур. Гэта прывядзе да апустыньвання 30% урадлівых земляў паўночнай часткі Афрыкі і пацяпленню вод каля берагоў Антарктыды прыкладна на 5 градусаў Цэльсія, што непазбежна выкліча поўнае раставанне ледніковых заходняй часткі гэтага кантынента.

Навукоўцы таксама прадэманстравалі, што далейшае пацяпленне выкліча ўзмацненне вятроў і будзе суправаджацца больш інтэнсіўным перамешваннем вод.

### АСТРАНОМЫ ЗНАЙШЛІ САМУЮ МАЛЕНЬКУЮ ПЛАНЕТУ ЗА МЕЖАМІ СОНЕЧНАЙ СІСТЭМЫ

**Астраномы з Нацыянальнага ўпраўлення ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (НАСА) выявілі самую маленькую планету за межамі Сонечнай сістэмы, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Планета з цвёрдай скалістай паверхняй атрымала пазначэнне Kepler-10b па назве касмічнага тэлескопа, з дапамогай якога і была выяўлена. Пасля васьмімесячных даследаванняў навукоўцы прыйшлі да высновы, што дыяметр знойдзенай экзапланеты ўсяго ў 1,42 раза больш за дыяметр Зямлі, а маса планеты складае прыкладна 4,5 масы Зямлі. Вядома, што нябеснае цела знаходзіцца ў сузор'і Цмока і размешчана ў 564 светлавых гадах ад Зямлі.

Адмыслоўцы НАСА запэўніваюць, што важнасць гэтага адкрыцця вельмі вялікая, бо сярод 700 выяўленых за апошнія 15 гадоў экзапланет абсалютную большасць складаюць масіўныя газавыя гіганты, а магчымасць знаходзіць скалістыя міры, параўнальныя па сваіх памерах з Зямлёй, з'яўляецца ў астраномаў не так часта.

### Факт

### Ішоў, паслізнуўся, упаў...

**У панядзелак Магілёўскі траўмапункт прыняў 117 пацыентаў. Адліга і, адпаведна, слізкія тратуары прыводзяць да падзенняў — а значыць, да ўдараў, вывіхаў і пераломаў.**

Дарэчы, менавіта пераломы складаюць чвэрць ад усіх траўмаў. Найбольш церпяць ад траўмаў у галалёдзіцу дзеці і нецвярозыя дарослыя. Сёлета 2 студзеня Магілёўскі траўмапункт прыняў рэкордную колькасць пацыентаў — 140 чалавек. А цяпер мае ў сярэднім сотню наведвальнікаў у дзень.

**Ілона ІВАНОВА.**

### Зарабляў на фільмах «для дарослых»

**Асуджаны прадпрымальны грамадзянін — жыхар Мінска, які зарабляў на тым, што ў звычайных паштовых бандэролях адпраўляў сваім пакупнікам навінкі кіно для дарослых.**

Бізнэс, можна сказаць, ішоў «на ўсе сто». Капіраваў «гарачыя» фільмы прама ў сябе дома. Рэкламаваў свае паслугі праз інтэрнэт на сайтах, дзе можна нешта прадаць, купіць. Кліентаў было шмат у розных рэгіёнах краіны, у тым ліку і ў Віцебскай вобласці. Пра бурную дзейнасць стала вядома праваахоўным органам. Пасля чарговай адпраўкі фільма пакупніку і выйшлі на гандляра «клубніцай».

Прыгаворам суда «прадпрымальнік», які распаўсюджваў і рэкламаваў парнаграфічную прадукцыю, асуджаны на два гады пазбаўлення волі. Улічваючы, што ён — бацька двух малых дзяцей, выкананне прыгавору адтэрмінавалі на год. Хутчэй за ўсё, правільныя высновы гандляр «клубніцай» зробіць. Ці зноў рызыкне?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Бяда з кухоннымі нажамі

**Менавіта яны найчасцей фігуруюць у міліцэйскіх зводках як «халодная зброя».**

Вечарам 5 студзеня беспрацоўная, якая знаходзілася ў кватэры па вул. Міцкевіча, што ў Баранавічах, атрымала цяжкае раненне грудной клеткі. Яе падчас сваркі ўдарыў кухонным нажом 29-гадовы жыхар горада. А 7 студзеня, таксама вечарам, у Баранавічах беспрацоўная нанесла кухонным нажом смяротную рану свайму сужыцелю. Трагедыя разыгралася ў кватэры па вул. Камуністычнай. І ў Брэсце ў гэты ж дзень скандал узнік паміж сужыцелямі, якія пражываюць па пр. Машэрава. Пасля застолля жанчына ўдарыла такім жа нажом гаспадара кватэры. Яго з цяжкімі пашкоджаннямі кішэчніка даставілі ў бальніцу. Ва ўсіх выпадках заведзены крымінальныя справы.

### Не вытрымала

Прадавец крамы «Прамтавары» ў в. Вулька-Дастаеўская Іванаўскага раёна выконвала абавязкі загадчыцы і не драмала, а прыхапіла ў краме розных матэрыялаў амаль на 4 млн рублёў. З вышэйадзначанай загадчыцы ўзялі абавязацельства на яўку.

### Сустрэлі каля бара

**Позна вечарам каля бара «Палескія легенды» ў Пружанах двое непаўналетніх (жыхары в. Яковічы і в. Стараволя) пакалечылі 46-гадовага вадзіцеля раённага камбіната бытавога абслугоўвання.**

Яны нанеслі чалавеку закрытую траўму жывата, пашкодзілі галаўны мозг, брыжэйку падуздышнай кішкі і артэрыі... Хуліганы знаходзяцца ў ізалятары.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### У Магілёве разыгралі «Кубак інавацый»

**У абласным конкурсе інавацыйных праектаў перамаглі дзве распрацоўкі: стварэння гарачаўстойлівых матэрыялаў на аснове бронзы і варыянт прымянення трэпелу ў якасці эфектыўнага мінеральнага дадатку ў кармы для жывёл.**

Падобныя конкурсы праводзяцца ў Магілёве ад 2005 года па ініцыятыве ЗАТ «Тэхналагічны парк «Магілёў» і пры падтрымцы ўладаў. Гэты «Кубак інавацый» адрозніваўся новымі ўмовамі: для ўдзелу ў ім запрашаліся толькі каманды ад ВНУ рэгіёна. Увогуле ў конкурсе бралі ўдзел 40 камандаў. Усе яны прайшлі майстар-класы, дзе іх вучылі, як увасобіць свае тэарэтычныя ідэі ў праекты, якія можна ажыццявіць на практыцы.

— Наша ідэя ў тым, каб цікавыя распрацоўкі ўкараніць у вытворчасці, — акцэнтаваў увагу **дырэктар ЗАТ «Тэхналагічны парк» Магілёў» Васіль МАЛАЧКОЎ**. — І такія прыклады ўжо ёсць: адно з прадпрыемстваў стала выпускаць серыйную прадукцыю для БелАЗа, а праект, які сёлета заняў трэцяе месца, неўзабаве ўвасобіцца ў лінію па вытворчасці прадукцыі з парошчанага зерня ў Магілёве.

Верагодна, што добрыя перспектывы на ўкараненне мае праект, які датычыцца трэпелу, бо багатыя радовішчы гэтай асадачнай пароды ёсць у Хоцімскім раёне, і ўвесь час ідзе гаворка пра іх разумнае выкарыстанне.

**Ілона ІВАНОВА.**

### За незаконныя высечкі — да адказу

**У перадсвяточныя дні ў лясах краіны Дзяржаўнай лясной аховай было праведзена 1 225 рэйдаў па спыненні і выяўленні незаконных высечак навагодніх дрэў.**

На парушальнікаў быў складзены 51 пратакол, паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. Вінаватыя выплацілі больш за 1 мільён рублёў штрафаў. Акрамя таго, імі пакрыта амаль 540 тысяч рублёў нанесенай лясному фонду шкоды. Найбольшая колькасць парушэнняў выяўленая ў Віцебскай і Мінскай абласцях — 16 і 11 адпаведна. З мэтай аховы лясных насаджэнняў паблізу населеных пунктаў, аўтамабільных і чыгуначных дарог працавала 377 спецыялізаваных пастоў Дзяржаўнай лясной аховы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Закон Рэспублікі Беларусь

## АБ РАТЫФІКАЦЫІ ПАГАДНЕННЯ ПАМІЖ УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І УРАДАМ ЛІТОЎСКАЙ РЭСПУБЛІКІ АБ ПАРАДКУ ЎЗАЕМНЫХ ПАЕЗДАК ЖЫХАРОЎ ПРЫГРАНІЧНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ЛІТОЎСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 22 снежня 2010 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 22 снежня 2010 года*

Ратыфікаваць Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Літоўскай Рэспублікі аб парадку ўзаемных паездак жыхароў прыгранічных тэрыторый Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, падпісанае ў г. Мінску 20 кастрычніка 2010 года.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

*10 студзеня 2011 года, г. Мінск.*
*№ 239-З*

**Тэкст з'яўляецца неафіцыйным перакладам Закона.**
**Афіцыйнае апублікаванне ажыццяўляецца ў афіцыйным перыядычным выданні «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь».**

### Абзац

◢ У Беларусі летась у выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці загінулі 232 працаўнікі.

◢ **Паляк вёз кантрабанды на 250 тыс. рублёў, а можа пазбавіцца грузавіка коштам 70 млн руб. 10 студзеня смаргонскія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні ў пункце пропуску «Каменны Лог» на беларуска-літоўскай мяжы пры афармленні на выезд з Беларусі аўтамабіля Mercedes з паўпрычэпам знайшлі кантрабанду. Грамадзянін Польшчы схаваў 25 літраў вадкасці з утрыманнем спірту (як мяркуецца, каньяк). Кошт кантрабанднага тавару склаў усяго 250 тысяч рублёў, а паўпрычэп, затрыманы да рашэння суда, ацэнены ў 70 мільёнаў рублёў.**

◢ У Невельскім раёне (Пскоўская вобл.) у ДТЗ загінулі два беларусы. Трагедыя адбылася 10 студзеня. Грамадзянін Беларусі 1972 г.н., які кіраваў аўтамабілем «Mitsubishi», выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў грузавое аўто «Renault» з маскоўскімі нумарамі. У выніку загінулі кіроўца легкавіка і яго 39-гадовы пасажыр.

◢ **У Пскоўскай вобласці ледзяной глыбай забіла дзіця, а ў Маскве льдзіна ўпала на каляску з немаўляткам. У горадзе Вялікія Лукі загінуў 8-гадовы хлопчык. На яго зваліўся кавалак лёду, з даху складскога памяшкання гарадской пажарнай часці. Пры дапамозе дамкрата ледзяную глыбу паднялі і дасталі з-пад яе цела хлопчыка. Заведзена крымінальная справа па небяспечнасці. А ў Маскве сямейная пара гуляла па вуліцы Гарыбальдзі са сваім нованароджаным сынам, які ляжаў у вазку. З казырка дома, дзе размешчаны гандлёвы цэнтр, на вазок звалілася маса снегу з ільдом. У хлопчыка, які нарадзіўся 1 студзеня г.г., зламана костка патыліцы і ўтварылася вялікая гематома. Ён знаходзіцца ў бальніцы.**

### Поўны абзац

◢ Абрабаваў... калядоўшчыкаў ва ўласнай кватэры. Удзень 7 студзеня тры хлапчукі-калядоўшчыкі (вучні 7 і 6 класаў) зайшлі ў адну з кватэр па вуліцы 50 гадоў ВЛКСМ у Баранавічах, каб павіншаваць гаспадароў са святам. Дзверы адчыніў малады чалавек і запрасіў падлеткаў у кватэру. Далей падзеі сталі развівацца па незвычайным сцэнарыі: замест таго, каб зрабіць гасцям падарунак, малады чалавек, пагражаючы, адабраў у непаўналетніх усё, што яны да гэтага моманту накалядавалі — цукеркі, садавіну, грошы. Агульны ўрон склаў крыху больш за 20 тыс. рублёў. Па заяве бацькоў аднаго з пацярпелых у дачыненні да 18-гадовага, раней судзімага гараджаніна распачата крымінальная справа.

◢ **Паранены ў галаву італьянец чхнуў куляй. Італьянец Дарка Санджэрмана атрымаў агнястрэльнае раненне галавы, але ў выніку не толькі застаўся жывы, але і змог самастойна пазбавіцца ад кулі, што засхрасла: у чаканні ўрачоў у бальніцы ён чхнуў — і куля сама вылецела праз нос. Дарка прыехаў у Неапаль з Турына, каб адсвяткаваць разам са сваёй дзяўчынай. Падчас прагулкі па горадзе ён атрымаў кулю ў скроню — і хутчэй за ўсё выпадкова. У бальніцу ён трапіў з моцным кровацячэннем. Пакуль пацярпелы чакаў урачоў, яму захацелася чхнуць, і такім чынам тэрміновая дапамога не спатрэбілася. Італьянец не атрымаў сур'ёзных траўмаў, аднак яго ўсё ж вырашана было праперыраваць, бо скроневая костка была пашкоджана і асколкі трапілі ў вока. Далечвацца ён будзе ў Турыне.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

ОАО «Приднепровье» проводит уменьшение Уставного фонда в размере 1,2% в соответствии с действующим законодательством. Претензии принимаются в срок до 12 февраля 2011 года.
*УНП 400315195*

Гродзенская фірма «ЛеЭрНо» пашырыла асартымент прадукцыі для жывёл выпускам адзення для сабак — камбінезонаў, куртак, футраў з тканіны рознай фактуры і колеру.
**На здымку:** майстар мастацкіх вырабаў Ларыса Орпік.
**БЕЛТА.**

**ЛОГОЗИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Медухово, участок № 5, кадастровый номер 623284503601000052 | 0,1782 га | Возможность подключения к водопроводу | 6 415 200 | 641 520 | 1 349 201 |
| 2 | д. Медухово, участок № 6, кадастровый номер 623284503601000049 | 0,1782 га | Возможность подключения к водопроводу | 6 415 200 | 641 520 | 1 349 201 |
| 3 | д. Медухово, участок № 7, кадастровый номер 623284503601000051 | 0,1782 га | Возможность подключения к водопроводу | 6 415 200 | 641 520 | 1 349 201 |
| 4 | д. Медухово, участок № 8, кадастровый номер 623284503601000050 | 0,1789 га | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу | 6 440 400 | 644 040 | 1 349 201 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619091105 в ЦБУ № 611 филиале 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, МФО 153001601, УНН 600181551, Логозинский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится **14.02.2011 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза Логойского района Минской обл., здание Логозинского исполнительного комитета.**

**УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) 14 февраля 2011 года проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)**
**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|---|
**10. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)**
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.

**Адреса филиалов Банка и телефоны, по которым можно получить справку о продаже облигаций:**
г. Брест, ул. Воровского, 11, тел. (8-0162) 27-06-61, 27-06-01,
г. Витебск, ул. Димитрова, 31, тел. (8-0212) 35-00-21, 37-23-14,
г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, тел. (8-0232) 79-26-89, 79-26-33,
г. Гродно, ул. Советских Пограничников, 110, тел. (8-0152) 52-25-87,
г. Могилев, пр-т Мира, 55, тел. (8-0222) 29-37-50,
г. Минск, пр-т Победителей, 91, тел. (8-017) 209-77-91, 209-77-73,
г. Минск, ул. Ольшевского, 24, тел. (8-017) 228-59-02, 228-65-35,
г. Минск, пр-т Жукова, 3, тел. (8-017) 218-57-11.

**Заместитель**
**Председателя Правления**
**ОАО «Белагропромбанк»** **С.П. Чугай**

**Главный бухгалтер**
**ОАО «Белагропромбанк»** **М.А. Шаповалова**

**Телефон Контакт-Центра Банка – 136**
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00–18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

**www.belapb.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь.* УНП 100693551.

Парламенцкі дзённік

# ДОБРАЯ ПУГА ЛЕПШАЯ ЗА ДРЭННЫ ПЕРНІК?

*Заканадаўцы дазволяць адпраўляць падлеткаў у спецустановы не толькі за крымінальныя, але і за сістэматычныя адміністрацыйныя парушэнні*

**«Дурная цётка!», — крычыць на ўсю краму шасцігадовы «анёлак» у ружовых банціках, які заблытаўся ў маіх нагах, спрабуючы, відаць, адшукаць маму. І я пачынаю здагадвацца, чаму некаторых малых б'юць... Не складана ўявіць, што з гэтага мілага ружовага воблачка будзе праз год. А праз дзесяць? Вось таму ў мяне і няма сваіх дзяцей, бо я ўсведамляю, што іх выхаванне — цяжкая безупынная праца, якой я не гатовая сябе абцяжарваць. Многія ж бацькі, па ўсім відаць, такім не замарочваюцца, і вельмі шкада. Бо дзеці — адна з тых «спраў», якімі лепш не займацца наогул, чым займацца абы-як. Навошта рабіць свет яшчэ горшым, чым ён ёсць?!**

**Адшукаць маму гэтай кветачкі жыцця цяпер захацелася ўжо мне. Як і яе на першы погляд нявінны атожылак, яна не падобна да бамжа. Але ж відавочна, што ганаровае званне, якім узнагародзіла мяне дзіцятка, не прыйшло да малой само па сабе... Матуля пачынае прасіць прабачэння адразу, не чакаючы маёй прамовы. Аднак ад міні-лекцыі ў маім выкананні гэта яе не пазбавіла. Не думаю, каб ад таго быў нейкі плён (хутчэй за ўсё, пасля майго сыходу матуля скажа дачушцы «ай, дурная цётка»), але ж і застацца ў баку таксама не магу. Так, экспертам у выхаванні дзяцей мяне не назавеш, да таго ж гэта, як і любыя стасункі ўнутры сям'і, — асабістая справа кожнага. Але мне сярод такіх «кветачак» жыць як-ніяк, дык чаму б не заняцца выхаваннем іх бацькоў? Мне ўвогуле здаецца, што корань усіх бедаў варта шукаць у сям'і. Ніхто не з'яўляецца на свет параджэннем пекла: усе забойцы, рабаўнікі і гвалтаўнікі ў дзяцінстве, упэўнена, выклікалі замілаванне сваёй усмешкай і прымяралі заечыя вушкі на ранішніку. І менавіта бацькам важна не прапусціць момант, калі гарэзлівы анёлак ператвараецца ў чарцянё: цяжкага падлетка, а там, глядзіш, — і ў неадэкватнага дарослага. Калі ўжо час засумнявацца — можа, не аднымі пернікамі варта выхоўваць, а часам не пашкодзіць і добрая пуга?!**

**Калі малы здзяйсняе злачынства, варта судзіць дарослага. Нават такія радыкальныя ідэі гучалі ў парламенце падчас абмеркавання новых заканадаўчых папраўак. Яны рэгламентуюць сістэму прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Дэпутат Анатоль ВАНЬКОВІЧ, які курыруе законапраект і цяпер рыхтуе яго да другога чытання, не схільны кідацца ў крайнасці.**

— Я б не перакладаў адказнасць выключна на бацькоў. Калі дзіця здзейсніла злачынства, значыць, вінаватыя ўсе. І бацькі, і школа, і камісія па справах непаўналетніх, і ўчастковы. Дзіця не ў ізаляванай прасторы знаходзіцца: і суседзі не павінны быць абыякавыя, калі яно бадзяецца без нагляду. З гэтым злом варта змагацца калектыўна. Мы ўсе павінны быць уважлівымі да кожнага малога. І далёка не заўжды гэта выхадцы з так званых няўдалых сем'яў. Здараецца, што бацькі занятыя бізнэсам — дзеці без догляду, грошай шмат, а спакус яшчэ больш.

Іншая справа, што паспяховасць сям'і не вымяраецца колькаснымі паказчыкамі: наяўнасцю абодвух бацькоў ды гадавым прыбыткам. Мне здаецца, лепш расці з адным з бацькоў у спакоі, чым з двума, якія жывуць як кошка з сабакам. І лепш атрымліваць больш бацькоўскай ласкі, чым дарагіх цацак. Відавочна, што не ўсё так паспяхова ў паспяховай сям'і, калі там праблемны падлетак. Думаю, ёсць рацыянальнае зерне ў тым, каб павышаць адказнасць бацькоў за ўчынкі дзяцей. Ну не бывае цяжкіх падлеткаў у няцяжкіх бацькоў... Але ж гэта так, маё лірычнае адступленне.

Не схільны палітык і да залішняй мяккацеласці ў дачыненні да малых парушальнікаў. І цалкам падтрымлівае заканадаўчае наваўвядзенне, якое дазволіць адпраўляць падлеткаў у спецустановы не толькі за крымінальныя парушэнні (як цяпер), але і за адміністрацыйныя. Аднак пра ўсё па парадку.

***— Што гэта за спецустановы?***

— Навучальна- і лячэбна-выхаваўчыя. Там цяжкіх падлеткаў перавыхоўваюць і навучаюць па курсе агульнаадукацыйнай школы і ПТВ. У лячэбна-выхаваўчых установах, напрыклад, можна стаць слесарам па рамонце аўто, а ў навучальна-выхаваўчых — сталяром.

Як высветлілася, такія дзейнічаюць у Магілёве, Крывічах. Спецвучылішча ёсць і для дзяўчат. Тут, у Петрыкаве, малых хуліганак спрабуюць захаваць кулінарыяй. Большасць з іх даводзіцца адвучаць ад крадзяжу.

***— Дарэчы, за якія правіннасці малым пагражае такая спецадукацыя?***

— За дробнае хуліганства, заведама хлуслівае паведамленне (тэлефануюць жа, што школу нібыта замініравалі), занятак прастытуцыяй, дробны крадзеж, распіццё спіртных, слабаалкагольных напояў ці піва, кіраванне аўтамабілем (тым больш у п'яным выглядзе) ды некаторыя іншыя парушэнні, здзейсненыя тройчы на працягу года. Прычым толькі тады, калі іншыя выхаваўчыя захады не далі станоўчага выніку. У спецустановы будуць накіроўваць і тых падлеткаў, якія хварэюць на алкагалізм, наркаманію ці таксікаманію і пасля праведзенага курса лячэння зноў здзейснілі правапарушэнні ў стане ап'янення.

***— Няўжо іх настолькі шмат, што даводзіцца рабіць такія захады?***

— Летась, напрыклад, іх было 342. Няшмат, здаецца. Але ж гэта нашы дзеці, наша будучыня. Нам неабыякава, хто прыйдзе нам на змену. Гэта бяспека нашай дзяржавы ў цэлым, — кажа намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы. — Прычым амаль кожны трэці пасля здзяйсняў крадзеж ці забойства — злачынствы, за якія мае быць ужо крымінальная адказнасць. Дык нашто чакаць, пакуль з'явяцца тысячы падлеткаў — крымінальных злачынцаў?! Заканадаўства працуе на апярэджанне. У развітых заходніх краінах (Англіі, Германіі, Швецыі), між іншым, такія ж нормы дзейнічаюць. Я не кажу ўжо пра СНД: тыя ж Расію ды Казахстан.

***— І ўсё ж, ці не драконаўская гэта мера: малога — і фактычна ў турму?***

— Няхай гэта і закрытая ахоўная тэрыторыя, але такія ўстановы ўваходзяць у сістэму адукацыі, а не сістэму МУС. Гэта не пакаранне, а прафілактыка. Задача — не дапусціць, каб падлетак перайшоў мяжу, за якой ужо не дробнае парушэнне, а злачынства і турма. Таму так важна ставіць заслон як мага раней. Упэўнены, калі пасля трэцяга парушэння яго адукацыяй і выхаваннем зойме спецыяльная ўстанова, вынік будзе абсалютна іншы. Дарэчы, паводле звестак МУС, толькі 10% выхаванцаў такіх устаноў здзяйсняюць у далейшым крымінальныя злачынствы. Хоць для нас і 10% — шмат: мы павінны стварыць такую сістэму, каб ніводзін падлетак не трапіў у турму. Спрэчак было шмат, але якой бы жорсткай не здавалася адпраўка адзінаццацігадовага дзіцяці ў спецустанову, гэта для яго ж карысці. Мы дадзім яму спецыяльнасць, і ён выйдзе адтуль не ізгоем з судзімасцю, а чалавекам, які знойдзе сабе прымяненне, у якім грамадства мае патрэбу. Нашто чакаць, пакуль ён трапіць за краты і перавыхоўваць яго будзе позна? Нават педагогі, якія ў пачатку пратэставалі і крытыкавалі гэтую норму, цяпер выступаюць за яе. Жыццё паказвае, што такія ўстановы даюць станоўчыя вынікі. Да таго ж, гэта прафілактыка не толькі ў дачыненні да самога цяжкага падлетка, але і аднагодкаў навокал. Яны ж глядзяць на яго, і мы павінны ахаваць і іх ад такой «рэкламы» асацыяльнага ладу жыцця. А для тых, хто сумняваецца, ці не жорстка гэта — выпраўляць малых у такія ўстановы, мы спецыяльна запланавалі вучобу дэпутатаў. Акурат напярэдадні разгляду законапраекта ў другім чытанні ўвесну. Праедзем па гэтых спецшколах, паглядзім умовы, у якіх жывуць і вучацца цяжкія падлеткі.

***— Некаторыя палітыкі прапануюць увесці каменданцкую гадзіну, забараніць з'яўленне падлеткаў на дварэ ўвечары. Як вам такое выйсце?***

— А вось гэта ўжо залішне. У нашай краіне такой патрэбы няма. Гэта неабходна, калі абстаноўка не кантралюецца. А ў Беларусі парадак — спакойна, ціха, не страшна знаходзіцца на дварэ і позна ўвечары. Гэта адзначаюць і замежныя госці, якія наведваюць нашу краіну. Не трэба забараняць падлеткам усё на свеце, у іх столькі энергіі — ім жа трэба яе некуды выліваць. Варта проста скіроўваць яе ў правільнае рэчышча. Трэба даць дадатковую нагрузку цяжкаму падлетку. Нездарма мы так актыўна спорт развіваем. Ёсць практыка, калі над праблемнымі падлеткамі бяруць шэфства ў воінскіх часцях, на прадпрыемствах. Там яны заўжды занятыя, ім цікава ў мужчынскім калектыве, дзе да іх ставяцца, як да дарослых.

Глядзіш, і атрымаюцца з іх неблагія дарослыя, якія ўжо не вырасцяць цяжкіх падлеткаў...

**Ала МАЧАЛАВА.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
**Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**
**Кантактны тэлефон: 292 44 12.**
**e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.**
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

Падрабязнасці

# «ГАРАДСКІЯ ЛІНІІ» СА ШВЕЙЦАРСКІМ КАМФОРТАМ І БЯСПЕКАЙ

**Як ужо паведамлялася, першы электрацягнік «Гарадскіх ліній» — пілотнага праекта новага фармату пасажырскіх перавозак — сабраны ў швейцарскім горадзе Буснанг. Да канца студзеня ён прыбудзе ў Беларусь, паведамілі ў прэс-службе Беларускай чыгункі.**

Электрацягнік даставяць са Швейцарыі на шасці грузавіках. Памеры машын з вагонамі даволі вялікія: даўжыня кожнай — 34 метры, вышыня — амаль 5 метраў. Аўтамабілі будуць пад'язджаць да чыгуначных шляхоў станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя». На пляцоўцы два краны паставяць састаў «Гарадскіх ліній» на цялежкі. У лакаматыўным дэпо «Баранавічы» ён пройдзе перадэксплуатацыйныя выпрабаванні. Потым састаў адправяць у сталіцу. Абслугоўваць і рыхтаваць гарадскую электрычку ў рэйс будуць на тэрыторыі маторавагоннага дэпо «Мінск». Для швейцарскіх цягнікоў там будзе рэканструяваны і аснашчаны сучасным абсталяваннем спецыяльны цэх.

«У «Гарадскіх ліній» прадугледжана ўласнае графічнае афармленне, свой колер. Таварны знак праекта — астра на чырвоным фоне. Гэты стыль знойдзе адлюстраванне не толькі ў афармленні цягніка, але і платформаў, форменнага адзення машыністаў, праязных дакументаў і інш.

Швейцарскія цягнікі адпавядаюць самым строгім сусветным стандартам. Яны надзейныя, эканамічныя, эканамічныя і камфортныя для пасажыраў, удакладнілі ў прэс-службе Беларускай чыгункі. У салонах — інфармацыйныя табло і дысплеі. У дарозе пасажыры змогуць даведацца пра час, тэмпературу паветра, хуткасць руху і месцазнаходжанне цягніка на маршруце. Вагоны абсталяваныя зручнымі крэсламі з высокімі спінкамі, трайным шкленнем вокнаў, магутным ацяпленнем, якое нават пры моцных маразах захавае тэмпературу паветра ў салоне на ўзроўні плюс 18 градусаў. У кожным вагоне ёсць месцы для пасажыраў з дзіцячымі каляскамі і веласіпедамі. Там прадугледжаны адкідныя сядзенні. У адным з вагонаў створаная спецыяльная зона для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, у прыватнасці, ёсць мацаванні для інвалідных крэслаў.

Адкрыты праход паміж вагонамі дае бачнасць усёй даўжыні саставу і свабоду перасоўвання, а спецыяльная сэнсіка гарантуе максімальна плаўны ход. У вагонах нізкі ўзровень падлогі, ёсць кандыцыянеры, цеплавыя завесы ўваходных дзвярэй, відэакамеры.

У лютым і сакавіку чакаецца прыбыццё ў краіну другога і трэцяга швейцарскіх электрацягнікоў. А ўсяго ў сакавіку мінулага года Беларуская чыгунка заключыла кантракт на пастаўку 10 электрацягнікоў. З іх 6 будуць працаваць па праграме гарадскіх ліній, а 4 — курсіраваць па рэгіянальных маршрутах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Лёгкі «беспарадак» стане адным з модных напрамкаў у прычосках-2011

**АСНОЎНЫМІ модынымі трэндамі 2011 года стануць доўгія валасы і вельмі кароткія стрыжкі. Аб гэтым БЕЛТА паведаміла трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па жаночых відах работ, цырульнік-мадэльер Наталля Хаданава.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Таксама ў модзе прычосак па-ранейшаму будуць панаваць буйныя локаны і мяккія хвалі доўгіх валасоў. Папулярнымі застануцца і распушчаныя (з эфектам мокрых) валасы, розныя гулькі, пучкі, вузлы, «конскі хвост», расказала яна.

Модны трэнд сезона 2011 вельмі кароткія стрыжкі «пад хлопчыка», таму можна спакойна забыць пра расчоскі, а ўзлахмачаныя пасмы нададуць чароўнасць маладосці і лёгкасці. Аднак такая прычоска не падыдзе круглатварым дзяўчатам або дамам прыемнай паўнаты, папярэджвае майстар.

Не здаюць сваіх пазіцый стрыжкі «боб», «паж», «карэ». У 2011 годзе яны павінны быць абавязкова «рванымі» або асіметрычнымі, гладкімі або аб'ёмнымі, а няроўныя праборы і неахайныя грыўкі толькі вітаюцца модай. «Прычоска павінна ствараць уражанне, быццам на яе падзьмуў лёгкі ветрык і ўзлахмаціў валасы», — растлумачыла спецыяліст.

У гэтым сезоне не абысціся і без грыўкі. У моду зноў увайшлі густыя, прамыя грыўкі ад самай макушкі, «школьныя» да сярэдзіны ілба і вельмі доўгія, «рваныя». «Сёння вельмі актуальна гульня на кантрастах. Можна насіць, напрыклад, прамую грыўку з кучаравымі валасамі», — расказала Наталля Хаданава.

Праверанай часам прычоскай для валасоў рознай даўжыні ўсё яшчэ застаюцца кучары, але не тугімі кольцамі, а дастаткова свабодныя. Нават можна сказаць, растрапаныя. Бо адзін з модных напрамкаў у прычосках-2011 — лёгкі «беспарадак». Дарэчы, яна падыходзіць амаль любой жанчыне, адзначыла спецыяліст.

Што датычыцца колеру валасоў, то ў 2011 годзе самымі моднымі будуць натуральныя адценні. «Моднымі адценнямі стануць тыя, якімі вас надзяліла прырода. Адмовіцца ад фарбавання — значыць не толькі атрымаць свабоду ад пастаяннага кантралявання працэсу адрастання валасоў, але і падкрэсліць уласную індывідуальнасць», — лічыць майстар. Тым, каму па нейкіх прычынах не падабаецца прыродны колер валасоў, варта падбіраць такія адценні фарбы, якія будуць выглядаць як натуральныя. Так, актуальнымі будуць усе адценні карычневага. Можна выбраць і рыжы колер, аднак ён павінен быць бліжэйшы адценнем да меднага чым да чырвонага колеру. «Шатэнкам і рыжым у надышоўшым годзе пашанцуе больш, чым уладальніцам валасоў іншых колераў. Менавіта іх валасы выглядаюць найбольш натуральнымі, таму рыжавалосым жанчынам і шатэнкам, каб адчуць сябе моднымі, фарбаваць валасы сапраўды неабавязкова», — лічыць спецыяліст.

Жаночыя сакрэты

# ХАЛОДНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

**КАБ быць прыгожай, у любую пару года трэба прыкладаць намаганні. Але ёсць адзін сезон, калі здаецца, што захаваць прыгажосць практычна немагчыма. Ці гэта толькі здаецца?**

Зіма прыносіць з сабой не толькі холад, снег і вецер. Зіма — гэта пастаянныя перапады тэмпературы, дэфіцыт сонца, паветра, высушанае цэнтральным ацяпленнем. Разам з паніжаным імунітэтам гэтыя негатыўныя фактары здольныя рабіць «цуды»: прымусіць скуру лушчыцца, раптам выклікаць вугрысты сып або «гусіныя лапкі» вакол вачэй. Зрэшты, гаварыць пра гэта няма сэнсу, таму што большасць з нас штогод зведвае ўсе «прывабнасці» зімоўкі ў горадзе на сабе. Лепш пагаварыць пра тое, як дапамагчы скуры перазімаваць з камфортам. На шчасце, індустрыя прыгажосці валодае важкім арсеналам сродкаў, здольных супрацьстаяць гэтаму стыхійнаму бедству.

### ПРЭВЕНТЫЎНЫЯ МЕРЫ

Прафілактыка лепш за лячэнне. Гэта правільна і для догляду скуры. Таму самым мудрым было б пачаць падрыхтоўку да зімовага сезона ўвосень, як толькі зменшыцца сонечная актыўнасць.

● Фруктовыя кіслоты робяць скуру менш успрымальнай да холаду. З верасня варта наносіць маскі з фруктовымі кіслотамі двойчы на тыдзень (калі няма супрацьпаказанняў). Можна зрабіць лёгкі гліколевы пілінг — ахоўныя ўласцівасці эпідэрмісу толькі ўзмоцняцца.

● Скуру трэба загадзя прывучаць да холаду. Ідэальны сродак гартавання — кубік лёду, які завяршае працэдуру мыцця. Каб лёд не выклікаў раздражнення, паспрабуйце замарожваць рамонкавы адвар. Калі лёд выклікае занадта моцную рэакцыю — мыйцеся добра халоднай вадой.

● Каб павысіць імунітэт скуры, трэба гартаваць яе ўсю цалкам, а не толькі ўчасткі, якія застаюцца адкрытымі. Лепшы варыянт — штодзённы кантрасны душ.

● Штотыдзень накладвайце на твар маскі, якія павышаюць эластычнасць скуры — з марскімі мінераламі і водарасцямі.

● Тонкую і далікатную скуру вуснаў неабходна сілкаваць і ўмацоўваць круглы год. Штодня масажуйце вусны сухой зубной шчоткай і наносьце на іх пажыўны бальзам.

### ЧАС «Ч»

Несумненна, з наступнай восені вы пачняце планамерна рыхтаваць скуру да зімы. Але што рабіць цяпер?

Па-першае, запомніце: зімой любому тыпу скуры патрабуецца больш тлусты сродак, чым летам. Ніякіх лёгкіх флюідаў перад выхадам на вуліцу! Пажыўны крэм на аснове раслінных алеяў. Крэм з алеем какавы — для сухой скуры, астатнім падыдуць саставы з алеем вінаградных костачак, парасткаў пшаніцы, жажаба. Гэта правільна, нават калі ў вас тлустая скура. Каб пазбегнуць вугроў, выбірайце спецыяльныя пажыўныя крэмы для свайго тыпу скуры — у іх, як правіла, утрымліваюцца антысептычныя і бактэрыцыдныя дабаўкі.

Калі вам давядзецца знаходзіцца на марозе даўжэй за 10 хвілін — за гадзіну да выхаду нанясіце на твар спецыяльны ахоўны крэм. Ад звычайных крэмаў ахоўныя адрозніваюцца большай шчыльнасцю. Апошнім часам на касметычным рынку з'явіліся спецыяльныя крэмы ад непагадзі. Такі крэм павінен быць у вас пад рукой на выпадак снегу і дажджу.

У ідэале, прыйшоўшы ў офіс, трэба зняць ахоўны сродак (ён не разлічаны на тэмпературу вышэй за 0 °С) і нанесці свой звычайны крэм. Калі гэта нерэальна — не забудзьцеся прыпудрыцца, каб пазбегнуць бляску. І насіце з сабой спрэй для асвяжэння твару — апошнія распрацоўкі дазваляюць рабіць гэта, не парушаючы макіяж.

Непатрэбны бляск скуры зімой — частая праблема ўладальніц змешанага тыпу скуры. Часам сродак для такой скуры аднолькава добры і для сухіх, і для тлустых участкаў. Але пры занадта капрызным надвор'і магчымыя збоі. У гэтых выпадках самае разумнае — вярнуцца да класічнай схемы догляду камбінаванай скуры. Наносьце на тлустыя ўчасткі крэм для тлустай скуры, а на сухія — для сухой. Выкарыстоўвайце крэмы адной маркі, каб выключыць непажаданую рэакцыю чужых кампанентаў. Гэта не так цяжка, як здаецца, а знешні выгляд скуры адразу палепшыцца.

### НЕ РАЗДРАЖНЯЙЦЕСЯ!

Галоўная праблема эпідэрмісу зімой — павышаная адчувальнасць і схільнасць да раздражнення. Як супакоіць скуру?

Выйсце — у штодзённым доглядзе. Як і ў любую пару года, ён уключае ў сябе ачышчэнне, танізаванне і ўвільгатненне. Але ёсць і асаблівыя прыёмы «зімовага часу».

Калі ачышчальны ласьён утрымлівае спірт, уважліва сачыце за рэакцыяй скуры. З'явілася пачырванене? Пераходзьце на сродкі з заспакаяльным эфектам (з утрыманнем азулену, марскіх водарасцяў).

Лепш за ўсё забяспечваць скуры дадатковае сілкаванне і змякчэнне з дапамогай касметычнага малачка або вяршкоў, рэшткі якіх выдаляюцца тонікам.

Глыбокую ачыстку скуры зімой робяць крыху радзей, чым у цёплы час года. Пазбягайце пілінгаў з буйнымі (асабліва — няроўнымі!) адлушчвальнымі крупінкамі! Аддайце перавагу маскам-плёнкам або маскам на аснове гліны.

Пажыўны крэм — вось «дзённая форма адзення» для скуры, незалежна ад яе тыпу і вашага ўзросту.

Калі ў вас алергія на холад, якая праяўляецца ў выглядзе вугрыстага сыпу, выкарыстоўвайце сродкі, якія не падсушваюць, а змякчаюць, і рабіце маскі з вітамінамі А і Е.

### ЗІМОВЫЯ ХІТРАСЦІ

● Сонцаахоўныя акуляры спатрэбяцца і ўзімку! Яны абароняць вочы не толькі ад рэзкага бляску снегу, але і ад ветру, снегу, дажджу. А заадно ад дачаснага ўтварэння мімічных маршчын, бо жмурыцца ўжо не прыйдзецца.

● Надакучлівы насмарк можа выклікаць раздражненне скуры вакол носа. Каб пазбегнуць гэтага ўскладнення, на вуліцы толькі прамочвайце нос сурвэткай, не траўмуючы скуру.

● Лячэбны крэм Д-пантэнол, які прадаецца ў аптэках, можа стаць «хуткай дапамогай» скуры. Ён здымае раздражненне, лушчэнне, алергію на холад. Насіце яго з сабой і прымяняйце лакальна, па меры неабходнасці.

### АПОШНІ ШТРЫХ

Дэкаратыўная касметыка зімой неабходная нам гэтак жа, як летам. Але асаблівыя зімовыя правілы ёсць і тут. Пазбягайце вадкай асновы пад макіяж — яна можа замерзнуць. Танальны крэм павінен быць больш густым або яго не павінна быць наогул. Можна перайсці на сухія таніравальныя сродкі са святлоадбівальнымі часцінкамі. Калі вы любіце тлустыя цені і румяны, зіма — ваш сезон прыгажосці! Дзякуючы сваёй кансістэнцыі гэтыя сродкі створаць дадатковы ахоўны бар'ер ад холаду і ападкаў. Пудру наносьце не пухоўкай, а пэндзлем, які рэгулярна прамывайце. Пухоўка можа стаць рассаднікам бактэрый. Паклапаціцеся аб водаўстойлівай і гіпаалергеннай тушы для веек. А ў астатнім прытрымлівайцеся модных тэндэнцый сезона!

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Загартоўка

# КАЛЯДНЫЯ МАРАЗЫ — ЧАС ДЛЯ МАРЖАВАННЯ

Здавалася б, чаго прасцей: не хочаш хварэць — лезь у палонку. Аднак спяшацца не трэба. Варта падумаць не толькі пра імгненныя плюсы, а і пра доўгачасовыя наступствы. Эксперыментальна даказана, што ў далейшым маржаванне можа даць штуршок да з'яўлення атэрасклерозу і рэўматызму, справакаваць хваробы нырак і суставаў... Таму пракансультуйцеся са сваім урачом, даведайцеся, якія нагрузкі здольны вытрымаць менавіта ваш арганізм.

Маржаванне — гэта не проста асаблівая водная працэдура, а лад жыцця, і занятак гэты не індывідуальны, а калектыўны. Калі вы рашыліся, а доктар вам дазволіў — ідзіце ў групу «маржоў». Не забудзьце спытаць пра медыцынскую ліцэнзію — гэта не павінен быць дваравы гурток пад кіраўніцтвам моцнага здароўем фанатыка.

У такіх групах па распрацаваных схемах вас паступова будуць прывучаць да халоднай вады, і нямала часу пройдзе, перш чым вы дасце нырца ў палонку. А зараз абавязковыя правілы.

**Правіла першае:** пачынаць і працягваць можна толькі паступова і, што не менш важна, рэгулярна. Першае аблiванне праводзіцца вадой, якую вы лічыце для сябе халоднай. Гэтую тэмпературу памерайце, а потым зніжайце яе на 1-1,5 градуса ў тыдзень.

**Правіла другое:** усе абціранні, абліванні і пагружэнні заканчваюць заўсёды халоднай вадой. Па вашым жаданні магчымыя наступныя варыянты: халодная вада можа прымяняцца пасля звычайнага ці гарачага душу, сама па сабе без папярэдняга душу, а таксама ў выглядзе так званага кантраснага душу.

Спосабаў прымянення вады таксама некалькі. Звычайна гэта абціранне ручніком, змочаным у халоднай вадзе, ці аблiванне. Уставаць пасля гэтага пад гарачы душ не варта. Добра, калі вы дазволіце скуры самой сагрэцца, а вадзе — самой абсохнуць, аднак калі ў вас няма часу, ваду можна прамакнуць ручніком.

Калі вы вельмі змерзлі, то дазваляецца расцерціся жорсткім ручніком, пакуль не сагрэецеся, аднак злоўжываць гэтым не варта, бо гульня ў ката і мыш з уласным арганізмам — не самы карысны занятак, і раз вы вырашылі яго загартоўваць, то ён павінен спадзявацца толькі на сябе і загравацца сам.

Выбар — абціравацца ці аблівацца — залежыць ад вас. Вы здаровыя — пачынайце адразу з аблiванняў, калі не вельмі, то спачатку — абціранні.

Кантрасны душ прымяняецца або ў выглядзе класічнага шатландскага душу (спачатку падаецца струмень вады з тэмпературай 35-40 градусаў на працягу 30-40 секундаў, а затым з тэмпературай 10-20 градусаў на працягу 10-20 секундаў), або некалькіх чаргаванняў халоднай і гарачай вады, але апошняй павінна быць заўсёды халодная.

**Правіла трэцяе:** калі абціранне — мерапрыемства бяспечнае,то аблiвацца трэба з розумам.

Вядома, лепей аблiвацца на вуліцы, але ў горадзе гэта складана — у ліфце распранутым не паедзеш, на балконе таксама ўсё бачна. Таму часцей за ўсё аблiваюцца ў ванне. Абавязкова пакладзіце на дно ванны ці драўляную рашотку, ці дыванок, або наліце цёплай вады па шчыкалатку. Ногі не павінны стаяць на халодным.

Аблiвацца лепей з вядра або таза, выліваючы на сябе адразу ўсю ваду. Добра, калі нехта дапаможа ў гэтай справе. Калі ж таз над вамі перавярнуць няма каму, а вада з душу ідзе з дастатковым напорам — смела карыстайцеся душам. Калі ж напор слабы, бярыцеся за вёдры. Толькі ўлічыце: з верхам напаўняць іх не варта — вы ж займаецеся загартоўваннем, а не рыхтуецеся да спаборніцтваў па падыманні цяжару.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

# ДЗЕНЬ ЧАРОЎНАГА СЛОВА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЧОРА ва ўсім свеце адзначаўся Міжнародны дзень «дзякуй». Я вырашыла падрыхтавацца загадзя. І напярэдадні правяла эксперымент. Склала спіс тых, каму я абавязкова сёння павінна падзякаваць. Пачынаю, безумоўна, з транспарту — месца, дзе мы адкрываем свой дзень і ад якога залежыць, як ён пройдзе. У спіс увайшлі кіроўца трамвая, кандуктарка, пасажыр, кіроўца любога аўто, незнаёмы на вуліцы, калега па працы, нехта з дамачадцаў, тэлефонны суразмоўца. Спіс атрымаўся вялікім, але простым, бо амаль кожнаму пазначаную я штодня дзякую не задумваючыся. Проста сёння хачу зрабіць гэта не па звычцы, а свядома.

Я даганяю перапоўнены трамвай, здалёк пачуўшы: «Асцярожна, дзверы зачыняюцца». Яны ўжо зачыніліся, але трамвай яшчэ не рушыў. Уваход, да якога я недарэчна падскочыла, расчыняецца. Як звычайна, ківаю галавой у знак удзячнасці, спадзеючыся, што кіроўца бачыць мяне ў люстэрка. Пасля ўзгадваю сваё абяцанне і праціскаюся скрозь шчыльны натоўп пасажыраў да кабінкі кіроўцы. Гэта займае некалькі прыпынкаў, пакуль у салоне не становіцца прасторна.

— Дзякуй вялікі, што пачакалі. Калі б не Вы, я б спазнілася на працу, — кажу праз шкло, акцэнтуючы кожнае слова.

Кіроўца, маладзенькая жанчына, спачатку, відаць, не разумее, пра што ідзе гаворка, а пасля саромеецца.

— Дзякуй Вам, — чую ў адказ. — Пасажыраў розных хапае. Бывае, зробіш яму прыемнае, дапаможаш, а ён пасля яшчэ нашкодзіць табе. Вось і задумваешся: ісці на ўступкі тым, хто спазняецца ці, як у рэкламе, перад самым носам дзверы зачыніць.

Мяркую, пачуўшы ў адказ на сваю дабрыню «шчыры дзякуй», кіроўца ў наступны раз больш ахвотна пачакае хвілінку, а зачыненыя перад носам дзверы застануцца толькі ў сацыяльнай рэкламе.

Прыемна пачынаць раніцу з абмену камплiментамі.

— Калі ласка — ваш білецік!

— Дзякуй.

— Дзякуй, што аплацілі.

Я заўсёды дзякую кандуктару. І ён заўсёды дзякуе ў адказ. Гэта простае слова можа тварыць цуды. Нездарма яго завуць «чароўным».

Мой тэлефон у кішэні разрываецца ад звону. Сумкі ў абедзвюх руках не даюць магчымасці адказаць на званок. Я ігнарую яго, імкнучыся здагадацца, хто гэта можа быць. Немаладая жанчына, што стаіць побач, нервова адзначае:

— У Вас тэлефон звоніць, адкажыце нарэшце!

Магчыма, ёй не падабаецца італьянская мелодыя, што стаіць у мяне на званку, магчыма, раздражняе вібра. Мне не хочацца, каб яна засталася такой раздражнёнай і не хочацца псаваць настрой сабе. Я хітрую:

— О, вялікі дзякуй. Вы такая ўважлівая. А я і не пачула. Хто гэта мог быць?

Хаваючы ўсю нязручнасць становішча, перакладаю сумку ў іншую руку і акуратна дастаю тэлефон. Гэта аказаўся нечакана важны званок. Я магла прапусціць яго.

— Дзякуй, калі б не Вы, я б засталася без працы. Гэта важны дзелавы званок. Дзякуй.

Жанчына ўсміхаецца:

— Ды няма за што. Я магла б і раней сказаць. Але такая прыгожая мелодыя гучала з дынаміка, што я заслухалася.

Дарогу я пераходжу асцярожна з таго часу, як трапіла ў аварыю. Няспешна прапускаю плынь аўтамабіляў, хоць, па правілах, яны павінны прапускаць мяне. Перад пераходам спыняецца старэнькі «мерседэс», за ім спыняюцца астатнія. Я баязліва сходжу з тратуара і ўсё яшчэ азіраюся, у любы момант гатовая пайсці назад. «Мерседэс» настойліва чакае, а яго кіроўца падбадзёрвае мяне ўсмешкай і махае рукой. Я смялею, усміхаюся ў адказ, прывычна ківаю галавой і гучна крычу «дзякуй!». Я заўсёды дзякую машынам, што прапускаюць мяне на пераходзе. Думаю, на наступнай «зебры» яны спыняюцца ахвотней.

Дарога ад прыпынку да працы займае літаральна дзве хвіліны. Але маленькая сцежка сярод вялікіх сумётаў значна запавольвае час. Гуськом асцярожна ступаюць людзі ў футрах і шапках, праходзячы міма разгарачанага дворніка. Ён умела арудуе шуфлем, моўчкі раскідвае снег. І я ведаю, што, калі буду ісці на абед, гэтай сцежкі сярод сумётаў ужо не будзе, будзе шырокі зручны праход. Дворнік яўна не ў гуморы: чалавеку прыходзіцца ўставаць раней за ўсіх, ён прыбірае снег, а мінакі яго разносяць.

— Дзякуй за Вашу працу. Мы толькі на працу едзем, а Вы ўжо столькі ўсяго зрабілі, — прыпыняюся я.

Дворнік паварочваецца тварам, заўважна мяняецца ў выразе твару і, не разгінаючы спіну, пачынае раскідваць снег прама з-пад маіх ног. Вузкая сцежка знікае на вачах.

На рабоце ўсё як звычайна. Адна старэйшая калега, якія любіць усіх павучаць, сёння аб'ектам крытыкі выбрала мяне. Я моўчкі выслухала прэтэнзіі, вытрымала невялікую паўзу і прамовіла:

— Дзякуй. Дзякуй, што клапоціцеся пра мае прафесійныя здольнасці, што вучыце выпраўляць памылкі і дапамагаеце ўдасканальвацца.

Цяпер павучанні з яе боку выглядаюць у форме прапаноў, а не ў форме прэтэнзій, як раней.

Дома я так чулліва падзякавала мужу за прыгатаваную вячэру, што ён нават згадзіўся вымыць посуд. Пазваніла сяброўка, каб выказаць крыўду, што я забылася на яе. Але, пачуўшы «дзякуй, што ты не забылася і тэлефануеш мне», спачатку разгубілася, а пасля нават праслязілася. Мы гаварылі так доўга, як не гаварылі вельмі даўно. Мы адчулі, як не хапае нам адна адной і як добра, калі ў свеце ёсць такія блізкія сябры. Гэта размова магла б скончыцца сваркай і высвятленнем, хто горшы, калі б не маё шчырае і своечасовае «дзякуй».

Адна знаёмая маладая сям'я з'ехала жыць у Амерыку. Там у іх нарадзілася дачка. Яна яшчэ толькі пачынае размаўляць і больш разумее англійскую мову, чым рускую. Але, прыехаўшы ўпершыню на радзіму бацькоў, у Мінск, яна з задавальненнем вымаўляла «дзякуй» і прадавачцы, і доктару, і таксісту, і бабулі, і бацькам — усім, хто прымаў удзел у яе жыцці. Гэтаму яна навучылася ў Амерыцы. Там прынята дзякаваць. Давайце і мы часцей ладзіць свята гэтага чароўнага слова. Бо яно сапраўды робіць цуды.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

# ЛЁС, ЯК ВІНО НА ПАЛЫНЕ...

Людзі між людзей

Сярод пустак, балот нашай роднай Клічаўшчыны раскінулася вёсачка Тачышча. Кажуць, калісьці тут жыў майстар тачыльных спраў: каму сякеру навострыць, касу, пілу ці нажы. Кажуць, добрая слава далёка чуваць. Вось і сюды з'язджаўся люд з навакольных вёсак, каб навастрыць рэчы, а мястэчка, дзе жыў майстар, пачалі называць Тачышча.

Зараз гэта вёсачка, як, дарэчы, і многія да яе падобныя, жыве састарэлы свой век. У некалькіх хатах жывуць сталыя людзі, дзеці іх разляцеліся па свеце і прыязджаюць да бацькоў на пабыўку. Я першы раз была ў гэтай вёсцы і пазнаёмілася з цудоўным чалавекам — Вольгай Андрэеўнай Шынкевіч.

Нарадзілася Вольга Андрэеўна ў Тачышчы. Тут маленькай дзяўчынкай гуляла ў лялькі, вучылася ў пачатковай школе, якая адкрылася перад вайной, тут сустрэла свой лёс, свайго каханага, Аляксея.

Так ужо здарылася, што гарэзлівая Волечка сядзела з ім за адной партай, ён употай тузаў яе за коскі, справаджаў да хаты, бо яны, іх хаты, стаялі побач. А потым у 5 клас пайшлі ў Ганчанскую дзесяцігодку, разам перажылі гады ваеннага ліхалецця, разам раслі і сталелі.

Спачатку Вольга і Аляксей любілі кожны паасобку і баяліся прызнацца ў гэтым нават сабе, саромеліся лішні раз пазіраць адзін на аднаго, каб не падумалі чаго.

Бацькі ў Алёшы не было: ён памёр, калі хлопчыку было ўсяго дзевяць гадочкаў.

Старанны і працавіты, статны і прыгожы, ён не мог налюбавацца на сваю Волечку, на яе броўкі шнурочкам, вялікія блакітна-шэрыя вочы, маленькія спрытныя ручкі, прыгожы дзявочы стан. З натоўпу дзяўчат яна заўсёды выдзялялася. Беленькая хусцінка, неяк па-свойму, непаўторна завязаная на чорных густых валасах, была тым нечым вельмі важным, вельмі ўдала знойдзеным, з-за чаго заглядаліся на яе, бадай, усе навакольныя кавалеры. А заспявае Волечка, а пойдзе танцаваць — спыніся ды паглядзі!

Спачатку Аляксей толькі глядзеў. Глядзеў і любаваўся, а потым неяк запрасіў на танец і, дачакаўшыся такта, тупнуў і завірыў. Яго стаптаныя чаравікі то ледзь краналіся дошак падлогі, то раптам гулка і выразна — пры паваротах улева ці ўправа — білі, як выгаворвалі, польку. Вакол яго цёмнавалосай галавы толькі мільгаў румяны тварык пад беленькай хусцінкай. А ўсё ж такі многія ў той вечар прыкмецілі і разгледзелі і чорныя броўкі, і пунсовы тварык, і вусны, што так і не змаглі стрымаць усмешку сораму і шчасця. Усім было відаць, а Аляксею — найлепш.

Гэта быў толькі ўступ да вялікага шчасця, кахання, што прыйшло, што пачалося ў тую ж ноч, калі ён цалаваў яе каля іхняга акна, а яна закрывала твар рукамі і прасілася: «Алёшка, міленькі, не трэба ...» Дый рукі гэтыя яму няцяжка было разнімаць, бо шчасця, гарачага шчасця яны ніяк не маглі ўдосталь напіцца, хоць прастаялі на снезе амаль да світання ...

А потым ён проста ўзяў і прыехаў на кані да суседняй хаты, забраў яе з няхітрым пасагам і перавёз да сябе, у маленькую хаціну, што збудавала бедная ўдава. Вяселля не гулялі, ішоў 1947 год. Так у лютаўскі дзень перапляліся карані двух сялянскіх родаў — Шынкевічаў і Собаляў.

Трэба зазначыць, што сям'я атрымалася моцная, як мароз, што трашчаў у той дзень, прыгожая, трывалая і цёплая, як сонейка, што палала ў небе пунсовым шарам.

Вольга пачала жыць са свекрывёй Зосяй Клімаўнай, лёсу якой не пазайздросціш. Ён сапраўды, як горкае, настоенае на палыне, віно. Нарадзіла жанчына сямёра дзяцей, ды не на радасць жыцця нарадзіла. Упарта, жорстка і быццам запланавана лёс адбіраў у яе дзяцей: адны паміралі ў 6, другія ў 8, 14 гадоў... Мы можам толькі здагадвацца, што перажыла маці, які нясцерпны боль паліў яе збалелую душу.

У 1947 годзе з яе вялікай некалі сям'і засталіся толькі Алена і Аляксей. Яна прыняла нявестку з радасцю і адкрытым сэрцам. Шанавала і шкадавала яе ўсё жыццё, прыглядалася і прыслухоўвалася, каб сын не пакрыўдзіў. Волечка спачатку саромелася свякроўкі. Бывала, прынясе вады, паставіць вёдры, апусціць рукі ды пытаецца:

— А што далей рабіць?

— Сядзь ды пасядзі, што ж ты будзеш рабіць? — гаварыла свякроў маладзіцы. Паслухмяна прысядзе, пасядзіць. Але нядоўга, бо зноў напарадзе нейкая работа.

Пакрысе прывыкаць стала Вольга да чужой хаты і да свякроўкі. А тут пайшлі і дзеткі — адно за адным, хата напоўнілася радасцю. Зося Клімаўна старалася ва ўсім дапамагаць, патроху вучыла нявестку ўсяму, чаму не паспела навучыць маці. І ёй, Зосі Клімаўне, тады яшчэ маладой 47-гадовай жанчыне, пачало здавацца, што ў рэшце рэшт лёс змілаваўся над ёй і вось паслаў гэтага анёла Волечку з унукамі, як падзяку за яе пакуты і нясцерпны, нястрыманы боль страты ёю народжаных дзяцей. Яна ўжо змірылася з бядою і гатова была на любыя ахвяры, толькі б яны, Аляксей і Вольга, ды ненаглядная дачушка, 20-гадовая Аленка, жылі і радаваліся жыццю. Як жа не цешыцца матулінаму сэрцу, калі прыгажуню Алену засватаў цудоўны хлопец Валодзя? Маці ладзіла дачку да шлюбу.

Бяда прыйшла нечакана, як гром сярод яснага неба, як самая жудасная бліскавіца. Раптоўна захварэла і памерла Аленка. Смерць шостага дзіцяці маці ўжо не магла перажыць. Яе вочы не перасталі ліць слёзы, яна пераблытала дзень і ноч і ведала толькі адну сцяжынку — на могілкі. Здаралася, што сын з нявесткай прачыналіся ноччу, каб паслухаць маці і не знаходзілі яе ў ложку, ішлі і забіралі на могілках, дзе яна бясконца пакутавала над маўклівымі зямельнымі ўзгоркамі, што насыпалі аднавяскоўцы над яе дзеткамі і мужам. Колькі працягвалiся пакуты? Дзі, бадай што, усё жыццё. Бы толькі плакаць больш баба Зося не змагла, з апошняй слязінкай, што выкацілася з яе вачэй у той жорсткі 1947 год, закацілася для яе яснае сонейка і наступіла непраглядная цемра — жанчына аслепла. Куды толькі потым ні вазіў Аляксей маці, якім спецыялістам ні паказваў — вярнуць зрок не ўдалося. Маці выплакала вочы ў прамым сэнсе слова.

Жывой, як кажуць, у магілу не палезеш. І яна жыла... Дзякуй Богу, сын з нявесткай жылі дружна, унукі раслі добрымі і чулымі. Усіх яна любіла і берагла, расказвала ім казкі, варыла вячэру, сцерагла іх сон. Сляпая, яна навучылася выконваць любую працу, нават абіраць бульбу. Толькі ў печы не падпальвала: баялася, што запалкі могуць нарабіць бяды.

А яшчэ любіла насіць адзенне, пашытае ўмелымі рукамі нявесткі. Абавязкова правядзе па адзежыне рукой, перамацае кожны шоўчык і папросіць адну з унучак, Валянціну, расказаць, якія колеры ёсць на тканіне... Бабуля Зоська не была ў сям'і сына цяжарам, яе любілі і шанавалі ўсе. Старэнькая цешыла сябе надзеяй памерці спакойна, без пакут, але наканаваныя лёсам выпрабаванні на гэтым не скончыліся.

Тая адзіная нітачка, што трымае яе на гэтым свеце, што дае ёй сілы жыць, яе апошняя надзея — сын — раптоўна і нечакана памірае. Яна чуе, як пад'ехала і спынілася машына, як грымаюць дзверы, як ляціць Валя. Яна ўжо аб усім здагадалася, але яшчэ цешыць сябе надзеяй і спадзяецца на цуд і пытае ўнучку:

— Ну, як там бацька???

Я не магу больш нічога дадаць. Старэнькая маці перажыла сына на 5 гадоў і памерла ў 94 гады.

Кажуць, чалавек жыве датуль, пакуль яго любяць і помняць. Вось так і бабуля Зося жыве ў сэрцах нявесткі, унукаў, знаёмых, якімі міжволі сталі і мы з вамі.

Сорак адзін год пражылі ў любові ды згодзе Аляксей і Вольга. Ад іх вялікага кахання нарадзілася шасцёра дзяцей.

**Аліна СУДНІК,** *г. Клічаў.*

Хакей. КХЛ

# ПУШКІНСКАЯ ДУЭЛЬ

**«Яны сышліся, лёд і полымя...» Нестарэючыя радкі Пушкіна смела можна адносіць і да хакея. Вечарам у панядзелак на пляцоўцы мыцішчанскага «Атланта» адзін супраць аднаго сышліся два галкіперы нацыянальнай зборнай Беларусі — Андрэй Мезін у складзе мінскага «Дынама» і Віталь Коваль у форме мясцовага «Атланта».**

Паядынак сапраўды ператварыўся ў дуэль галкіпераў. Нападаючыя абедзвюх камандаў раз за разам стваралі небяспечныя моманты то каля адных, то каля другіх варот. Але ў абсалютнай большасці выпадкаў «лёд» — спакойны і ўпэўнены Мезін ды «полымя» — эмацыйны, але не менш упэўнены Коваль, выконвалі свае абавязкі бездакорна.

Што цікава, абодва галкіперы маглі наогул не з'явіцца гэтым вечарам на пляцоўцы. «Дынамаўцы» праводзяць напружаны адрэзак чэмпіянату, гуляюць праз дзень на другі — і з разуменнем можна было чакаць, што Марэк Сікора дасць Андрэю Мезіну адпачыць, усё ж у запасе не менш вопытны Роберт Эш. Няўстойлівыя пазіцыі ў «Атланце» і ў Віталя Коваля. Моцны канкурэнт у выглядзе Канстанціна Баруліна часта пакідае беларуса на лаўцы запасных. Тым больш у папярэднім матчы супраць рыжскага «Дынама» Коваль згуляў не вельмі ўпэўнена. Аднак чэшскі настаўнік «Атланта» ўзяў за звычай у гэтым сезоне выпускаць Коваля супраць сваёй былой каманды і ад яго не адступае.

Найбольш небяспечным для варотчыка «атлантаў» аказаўся першы перыяд. На дзіва, ініцыятывай з першых хвілін завалодалі не гаспадары, а «Дынама». Добрыя магчымасці адкрыць лік мелі Кулакоў, Петр Сікора, Корса. Аднак адкрыў лік Ёзаф Штумпел. Пасля кідка Кулакова славак не моцна, але дакладна дабіў шайбу, адправіўшы яе паміж канькамі Коваля.

Сярэдзіна другога перыяду адзначылася шыкоўным момантам, калі «зубры» маглі павялічыць перавагу. Тры хакеісты «Атланта» амаль адзін за адным атрымалі штраф за парушэнне правілаў, і мінчане дзве хвіліны запар гулялі ў фармаце 5:3. На жаль, беларусы не здолелі стварыць штосьці па-сапраўднаму небяспечнае, гаспадары адбіліся, з палёгкай уздыхнулі — і панесліся ў атаку на вароты Мезіна. Аднак, трэба адзначыць, галкіпер «Дынама» гэтым вечарам быў проста непаўторны. Моманты, калі Андрэй прымушаў мыцішчанскіх хакеістаў хапацца за галаву ад бяссілля, проста здзіўлялі — шайба, як зачараваная, ляцела акурат у пастку варотчыку. А тое, як Мезін паспеў зрэагаваць на кідок упрытык Мазякіна напрыканцы авертайма, наогул трэба паказваць у якасці прыкладу падчас заняткаў у дзіцячых хакейных школах. Прабіць Мезіна атрымалася толькі ў Дзмітрыя Упера, які перавёў гульню ў той самы авертайм.

У апошнім, скарочаным, перыядзе атакаваў амаль толькі «Атлант». Чарговыя выдаленні Генры і Мялешкі не толькі прымусілі «дынамаўцаў» прыціснуцца да сваіх варотаў, але і пакінулі беларусаў без свайго лепшага выканаўца булітаў. Магчыма, менавіта Мялешкі не хапіла «Дынама», каб у булітнай серыі перайграць Коваля. Хаця трэба адзначыць і выдатныя дзеянні Віталя, якія прынеслі перамогу «Атланту» — 2:1.

«Дынама» вяртаецца з выязной серыі з нядрэнным уражаем — 6 з 9 магчымых балаў. Ужо сёння ўвечары «зубры» на «Мінск-Арэне» прымаюць піцерскі «СКА».

**Яўген ВАРАКСА.**

## У Беларусі работнікам, якія не курыць, бясплатна раздаюць экзатычную садавіну

Беларускі бізнэс далучаецца да здаровага ладу жыцця. Так, уладальнікі першай у рэспубліцы кампаніі «Італтэхнабуд» (аднаго з найбуйнейшых у краіне пастаўшчыкоў керамічнай плітак і сантэхнікі, прадстаўленага гандлёвымі маркамі «Лантрэ» і «Ф'южэн Хаус»), якая не курыць, заахвочваюць сваіх работнікаў экзатычнай садавіной, штогадовымі «зарніцамі» і турыстычнымі пуцёўкамі, а суіскальнікаў з шкоднымі звычкамі настойліва просяць не турбаваць.

**БЕЛТА.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

*(в дополнение к проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» № 53 от 21 марта 2009 г.)*

**Информация о про

# БЕЗ НАКІРАВАННЯ З МЕСЦА БУДУЧАЙ ПРАЦЫ МЕДЫКІ ЗАКЛЮЧЭННЯ НЕ ДАДУЦЬ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

***НАШ даўні чытач з вёскі Шчэчыцы Мастоўскага раёна Уладзімір Мікалаевіч Сідар напачатку года сутыкнуўся з чарговай праблемай, з якой, па традыцыі, пазнаёміў рэдакцыю і запатрабаваў, каб у справе быў наведзены парадак. Натуральна, такі, якім ён бачыцца нашаму заяўніку. А здарылася наступнае.***

Надумаў Уладзімір Мікалаевіч у пачатку года працаўладкавацца паштальёнам у суседнюю вёску Лунна. А для таго трэба было, зразумела, прайсці медкамісію. І ўсё б нічога, але тут узнікла згаданая праблема: з тэрапеўтам. Яго трэба было праходзіць па месцы жыхарства, але — па накіраванні. А за ім трэба было ехаць у Масты, у галаўны офіс арганізацыі, куды збіраўся ўладкоўвацца наш чытач. А гэта, па словах Уладзіміра Мікалаевіча, ні многа, ні мала — 30 кіламетраў у адзін бок.

— Дык што, трэба было 60 кіламетраў праехаць толькі для таго, каб узяць паперку? Гэта ж цэлы дзень змарнаваны! Да таго ж транспарт да райцэнтра ў нас не так часта ходзіць. Вось, напрыклад, сёння з'ездзіць у Масты ў мяне не атрымалася. І заўтра наўрад ці выйдзе. Дык вы патэлефануйце ў Міністэрства аховы здароўя, спытайце: што за правілы такія?! — распавядаў нам Уладзімір Мікалаевіч.

Карыстаючыся выпадкам, заяўнік папрасіў даць адказ і на яшчэ адно пытанне, таксама на «медыцынскую тэму». Наш чытач — вадзіцель. Усе яны павінны рэгулярна праходзіць адпаведную медыцынскую камісію. Дык вось Уладзімір Мікалаевіч сцвярджаў, што ў іх раёне на яе трэба запісвацца загадзя... за паўгода. Адкуль такая інфармацыя, няўжо заяўнік ужо сутыкнуўся з такім становішчам спраў? Ды не, адказваў той, размаўляў тут нядаўна са знаёмымі вадзіцелямі, дык тыя запэўнілі, што ўсё менавіта так і ёсць. А таму — разбярыцеся, дайце адказ.

Усе гэтыя нараканні чытача мы напачатку пераадрасавалі ва **ўпраўленне аховы здароў'я Гродзенскага аблвыканкама**. Там паабяцалі аператыўна разабрацца ў сітуацыі, адначасова здзівіўшыся, чаму заяўнік не патэлефанаваў на «гарачую лінію» ўпраўлення.

Гэтак жа аператыўна з рэдакцыяй звязалася **загадчыца паліклінікі ўстановы аховы здароўя «Мастоўская цэнтральная раённая бальніца» Галіна РУСАК**. Яна паведаміла, што, сапраўды, у мінулы панядзелак наш чытач звяртаўся да ўчастковага ўрача ў сувязі з працаўладкаваннем на пошту. Але не прад'явіў накіравання на працаўладкаванне.

— Між тым існуе пастанова № 33 Міністэрства аховы здароўя «Аб парадку правядзення абавязковых медыцынскіх аглядаў работнікаў» ад 8 жніўня 2000 года. Згодна з гэтым дакументам, без папярэдне прад'яўленага накіравання на працаўладкаванне заключэнне ўрача не можа быць выдадзена, — расказала Галіна Паўлаўна. — Гэта не прыхамаць. Трэба разумець, што існуюць розныя прафесіі, спецыяльнасці, і для кожнай з іх могуць быць свае шкодныя фактары, паказанні ці супрацьпаказанні здароўя канкрэтнага чалавека. Спецыялістам трэба дакладна ведаць, які аб'ём даследаванняў праводзіць. Каб не марнаваць час, ваш чытач мог загадзя патэлефанаваць урачу, каб атрымаць такую інфармацыю.

Як паведаміла далей Галіна Русак, назаўтра пасля таго непаразумення чытач прывёз патрэбнае накіраванне, тэрапеўт агледзеў заяўніка і падпісаў патрэбнае заключэнне, што ніякіх супрацьпаказанняў для працы паштальёнам Уладзімір Мікалаевіч не мае.

Што ж тычыцца другога пытання — адносна папярэдняга запісу за паўгода для праходжання вадзіцельскай медкамісіі — загадчык паліклінікі зноў жа заўважыла, што чытач з такім пытаннем не звяртаўся.

— Ужо мінімум гады як два такой праблемы ў нас няма. Цяпер пра такое становішча спраў, напэўна, можна пачуць толькі ў выглядзе вадзіцельскай байкі. Зараз пасяджэнне камісіі праходзіць штотыднёва — у працоўныя дні па серадах з 14 да 17 гадзін, — заўважыла суразмоўца. — У той жа дзень, згодна з заканадаўствам, вадзіцелі атрымліваюць патрэбныя ім медыцынскія даведкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Кватэрнае пытанне

# ...АЛЕ МОЖНА І КУПІЦЬ

***УСІМ вядома, што ў будаўніцтве жылля маладым сем'ям дзяржава дапамагае. А вось што з пакупкай? На яе, як сказалі ў нашым райвыканкаме, банк можа выдаць крэдыт пад 14,5% гадавых — і то памеры яго будуць залежаць ад заробку. Атрымліваецца, што калі працуе толькі адзін з сужэнцаў (другі ў дэкрэтным водпуску), то за гэтыя грошы дом не купіш.***
***Ці так гэта на самай справе?***

**Валянціна ПАЎЛАВА,** *г. Калінкавічы.*

Сапраўды, у адпаведнасці з падпунктам 1.2 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб выдзяленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» ільготныя крэдыты выдаюцца адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк» грамадзянам, якія стаяць на чарзе з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, у першую чаргу на будаўніцтва і рэканструкцыю жылых памяшканняў.

Падпунктам 1.9 Указа № 185 вызначана, што льготныя крэдыты на набыццё (пакупку) жылых памяшканняў выдаюцца грамадзянам у выпадку немагчымасці паляпшэння іх жыллёвых умоў шляхам будаўніцтва жылля (г. зн. калі ў гэтым населеным пункце, у прыватнасці, не ажыццяўляецца будаўніцтва новага жылля). Толькі для шматдзетных сям'яў з гэтага правіла зроблена выключэнне, яны могуць у вызначаным парадку атрымліваць ільготныя крэдыты як на будаўніцтва (рэканструкцыю), так і на набыццё жылых памяшканняў.

Што датычыцца канкрэтнай дапамогі дзяржавы маладым сем'ям, якія вырашылі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы не шляхам будаўніцтва, а праз набыццё жылых памяшканняў у існуючым жыллёвым фондзе, то і ў гэтым выпадку яны могуць разлічваць на фінансавую падтрымку.

Маладым сем'ям (сем'і, у якіх хоць бы адзін з сужэнцаў заходзіцца ва ўзросце да 31 года або знаходзіўся ў такім узросце на дату прыняцця на ўлік з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў) можа быць аказана фінансавая падтрымка дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па няльготных крэдытах, атрыманых на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё (пакупку) жылых памяшканняў.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 лістапада 2007 года № 585 такая фінансавая падтрымка выдзяляецца згодна з рашэннем мясцовага выканаўчага і распарадчага органа па пастаянным месцы жыхарства (месцы рэгістрацыі па месцы жыхарства крэдытаатрымальніка) маладым сем'ям пры нараджэнні першага дзіцяці (або наяўнасці аднаго непаўналетняга дзіцяці) у памеры 20 бюджэтаў пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, а пры нараджэнні другога дзіцяці (або наяўнасці дваіх непаўналетніх дзяцей) — 40 бюджэтаў пражыткавага мінімуму. Бюджэт пражыткавага мінімуму (БПМ) зацвярджаецца штоквартальна. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2010 г. № 1567 БПМ установлены ў памеры 283050 рублёў на перыяд з 1 лістапада па 31 студзеня 2011 г.

Ільготныя крэдыты на набыццё жылых памяшканняў, пабудаваных арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі спецыяльна для продажу, выдаюцца ў парадку, які прымяняецца пры крэдытаванні будаўніцтва жылых памяшканняў.

**Віктар САВІЦКІ.**

Падзячны ліст

# «Дзякуй за клопат пра людзей і за транспартны камфорт»

**У наш час, калі кожны сам за сябе, клопат пра блізкага заўсёды выклікае захапленне і шчырую ўдзячнасць.**

Я хачу выказаць падзяку ПТУП «Ірынтранссэрвіс» і яго генеральнаму дырэктару Канстанціну Эдуардавічу Франевічу. Гэтае прыватнае транспартнае ўнітарнае прадпрыемства знаходзіцца ў г. Узда, гэта Мінская вобласць, 68 км ад сталіцы. Справа ў тым, што гарадок наш будуецца, пашыраецца, ствараюцца новыя сем'і. Многія жыхары працуюць або вучацца ў сталіцы, а таму частыя паездкі ў кірунку Узда—Мінск і Мінск—Узда па некалькі разоў на дзень для іх — звыклая справа. У нашым горадзе ёсць вуліцы, якія знаходзяцца далёка ад цэнтра, а ў непагадзь — у дождж або ў снегапад — чалавеку складана дабрацца за некалькі кіламетраў да цэнтральнага прыпынку. Такі прыклад з жыхарамі вуліц Маладзёжная, Лугавая і іншых, якія мы называем «прыватным сектарам». Але варта толькі зрабіць званок у дыспетчарскую ПТУП «Ірынтранссэрвіс», і вадзіцель пад'едзе да бліжэйшага аўтобуснага прыпынку, які знаходзіцца бліжэй да вашага дома, у любы зручны для вас час. Канстанцін Эдуардавіч стварыў моцную згуртаваную каманду вадзіцеляў: нягледзячы на сваю маладосць, гэта хлопцы з вялікім стажам працы. Канстанцін Эдуардавіч заўсёды ветлівы, далікатны, дыпламатычны, ведае падыход да людзей: пажартуе з маладымі, падтрымае ў размове сталых людзей, дапаможа пажылым. Вось ужо больш як 4 гады яго маршрутныя таксі дапамагаюць жыхарам г. Узда пераадолець адлегласць да сталіцы ўсяго за адну гадзіну. Для параўнання: паездка з мікрараёна Курасоўшчына да вакзала, улічваючы чаканне транспарту, доўжыцца 50 хвілін, а паездка з горада Узда ў горад Мінск — 58 хвілін. Гэта хутка і зручна.

Канстанцін Эдуардавіч ведае цану чалавечым стасункам і разам са сваёй маладой жонкай Ірынай у дабрыні і любові выхоўвае дачушку Дашачку.

Хочацца яшчэ раз выказаць удзячнасць ПТУП «Ірынтранссэрвіс» і яго гаспадару, генеральнаму дырэктару і проста добраму чалавеку Канстанціну Эдуардавічу Франевічу за яго клопат пра людзей і транспартны камфорт.

**Алена Вікенцьеўна КАЗНАДЗЕЙ.**

Погляд

# «ВЫЙШЛІ МЫ ЎСЕ З НАРОДУ...»

**ДОЎГА падбіраў загалавак да гэтага артыкула і спыніўся на радку з папулярнай у свой час песні: «Вышли мы все из народа, дети семьи трудовой...» У гэтых словах ёсць праўда.**

Увагу грамадскасці ў надышоўшым годзе прыцягнула Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 4, якая павінна адкрыць перад бізнэсам краіны новыя гарызонты. Але перад тым, як павесці размову пра гэты дакумент, хачу спыніцца на некалькіх фактарах, ад якіх залежыць эфектыўнасць законаў.

Здараецца так, што прынятыя закон ці пастанова не выконваюцца ці ігнаруюцца некаторыя іх палажэнні — дастаткова зазірнуць на сайт Пракуратуры краіны.

Калі ў грамадстве законнасць не лічыцца нормай жыцця, а людзі прытрымліваюцца сумна вядомай устаноўкі «закон, што дышаль...», то чакаць ад закона эфектыўнасці не даводзіцца. Уплывае на сітуацыю і слабы кантроль за выкананнем такой пастановы. А бывае, што прыняты закон закранае інтарэсы чалавека пры ўладзе — стварае для чыноўніка дыскамфорт, і тады ад гэтага закона застаецца толькі форма, а сутнасць «выветрываецца».

Спынімся на прынцыпе «аднаго акна». Такое «акно» сёння ёсць у кожнай дзяржаўнай установе, прадпрыемстве. Задума была добрая, бо чалавек мог афармiць дакументы ў адным месцы і яму не трэба было хадзіць па розных кабінетах і збіраць подпісы ды паперкі. Спачатку каля такіх «вокнаў» тоўпіліся людзі, а затым неяк усё зацiхла, супакоілася... Чалавек падыдзе, пацікавіцца, нават можа атрымаць нейкую даведку ды адыходзіць.

Побач з «адным акном» цяпер вісяць некалькі дзясяткаў інструкцый, якія наведвальнікі не чытаюць, бо ідуць адразу да «акна» — іх ветліва сустракаюць і для афармлення дакументаў прапануюць два варыянты.

На працягу месяца ці двух (!) і за грошы табе могуць дакументы афармiць. А на пытанне «Чаму так доўга?» адказ просты: «Вы ў нас не адзін».

А па другім варыянце — чалавек можа ўсё афармiць сам за нейкі тыдзень. Гэты варыянт выбраў і я перад Новым годам. І прэтэнзій няма каму прад'явiць, бо табе ў «адным акне» не адмовілі.

Паводле закона нельга піць піва ў грамадскіх месцах, але ж п'юць як пілі — у скверах, на прыпынках, у электрычках.... Жыць і прытрымлівацца ўстаноўленага парадку наш чалавек яшчэ не можа.

Не заўсёды выконваюцца некаторыя палажэнні Указа Прэзідэнта за № 43 і Закона «Аб сумесным домаўладанні» — няма кантролю з боку мясцовай улады. Хоць там усё прапісана і абумоўлена ў інтарэсах грамадзян.

**ЦУГЛІ**

*Не магу забыць эпізод са свайго дзяцінства. Аднойчы на выгане сабраліся вясковыя мужчыны, да іх пад'ехаў на жарэбчыку конюх. Злез і прапанаваў мне адвярнуць ад чыгункі калгасных коней. Ён падсадзіў мяне ў сядло, і я радасна тузануў павады. Мне было гадоў дванаццаць. Незацугляны вараны, адбегшы метраў сто, зразумеў, хто ў сядле, і пачаў скубці траву, а затым галопам падаўся да коней і зноў узяўся за траву. Я тузаў павады, крычаў, але жарэбчык не павёў нават вухам . Праз нейкі час прыйшоў конюх і сцягнуў мяне з сядла.*

Ніводная краіна не можа абысціся без чыноўнікаў, але пры нашай сістэме ўлады, калі мясцовая ўлада не падкантрольная грамадскасці, чыноўнік павінен быць «зацюгляным» і адчуваць моцную руку, інакш будзе толькі «скубці траву».

Што і здарылася ў Пінску. Інспекцыі, кантралёры, мясцовая ўлада не маглі ўплываць на сітуацыю на ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў», дзе парушалася заканадаўства.

Сёння нехта ўздыхае, што ўказам Прэзідэнта канцэрн «Беллеспаперапрам» вызначаны ўпраўляючай кампаніяй ЗАТ «Пінскдрэў». Маўляў, у прадпрыемстве адсутнічае дзяржаўны пакет акцый.

Я не хачу разглядаць юрыдычны бок справы. Відавочна, у законе ёсць прабелы і нестыкоўкі. Але ж падчас трагедыі загінула 14 чалавек, многія былі траўмаваныя, а гаспадары кампаніі могуць выйсці сухімі з вады. Але няхай усё вырашае суд.

Калі чуеш, што ў Беларусі дыктатура, то ўзнікае думка: «Пры дыктатуры сістэма працуе, як адладжаны гадзіннік і чыноўнікі ходзяць па струнцы, а ў нас яны жывуць даволі прывольна». Можа, я памыляюся, але, назіраючы за жыццём на перыферыі, думаеш менавіта так.

А пішу я гэта для таго, каб яшчэ раз падкрэсліць, што ўсе мы — чыноўнікі, прадпрымальнікі, як і спажыўцы, — заложнікі свайго грамадства.

Што рабіць з фермерам, які ўзяў у дзяржавы не адну сотню мільёнаў на адкрыццё новых рабочых месцаў, а нічога не зрабіў? Грошы неабходна вярнуць, а іх няма.

Вядома ж, падключыліся праваахоўныя органы і ў адпаведнасці з законам... Можна не сумнявацца, што ў такім выпадку закон спрацуе і фермер верне дзяржаўныя грошы. Але так павінна быць не толькі з фермерам, які, напэўна, пераацаніў свае дзелавыя якасці, а з кожным, хто парушыў закон.

На гэтай ноце мы падышлі і да Дырэктывы № 4. Хацелася б, каб яна спрацавала, бо ў адпаведнасці з ёю ў чалавека будуць магчымасці максімальна раскрыць свае здольнасці на глебе прадпрымальніцтва, яна падштурхоўвае да дзелавітасці, да праяўлення ініцыятывы.

Я выйшаў на некалькіх прадпрымальнікаў. Але аказалася, што Дырэктыву № 4 яны не чыталі, выслухоўваць жа іх эмоцыі не было сэнсу.

Кароткае інтэрв'ю ўдалося ўзяць у **фермера Івана Арлоўца**, які мае гаспадарку ў 20 кіламетрах ад Ліды. А выйшаў я на гэтага фермера выпадкова. Жонка прыйшла з краны і паказала пучок зялёнай цыбулі: «Зірні, як фермеры навучыліся працаваць». Корчыкі цыбулі — адзін у адзін — воку ўцеха, і ўпакоўка выдатная. Чым не еўрапейскі стандарт? Падумалася, што з гэтым фермерам размова адбудзецца. Чалавека не бачыў, але яго прадукцыя падказвала, што справу маеш з гаспадаром.

*— Будзем спадзявацца, што Дырэктыва створыць спрыяльныя ўмовы для дзелавых людзей і дасць стаўчыя вынік, але пачакаем, калі яна ўступіць у сілу,* — сказаў фермер.

**— Іван Тадэвушавіч, вам, як фермеру, пастаянна даводзіцца кантактаваць з мясцовай уладай. Скажыце, чыноўнікі ствараюць праблемы?**

*— Я чалавек законапаслухмяны, і ніякіх праблем з мясцовай уладай у мяне няма, бо ў раёне мяне падтрымліваюць. Трэба было мне 50 гектараў зямлі — далі. Нават самі прапанавалі дзве фермы за 1 базавую велічыню, і я ўзяў. Не магу нічога кепскага сказаць, акрамя як падзякаваць за падтрымку.*

**— Можа, вы «стахановец» сярод фермераў, бо адкуль такая ўзаемная любоў? На ўладу фермеры і прадпрымальнікі, як правіла, скардзяцца.**

*— Фермерская гаспадарка «Арловец» — лепшая на Лідчыне. Можа, гэта і няцiпла, але я карыстаюся аўтарытэтам у раёне. Лічу, што адносіны да фермера залежаць ад выніку яго дзейнасці. У мяне працуюць 12 чалавек, а сваю прадукцыю — цыбулю-пяро — мы прадаём па 11 тысяч рублёў за кілаграм у той час як канкурэнты — па 16 тысяч) і рэалізоўваем яе не толькі на Гарадзеншчыне, а і ў суседніх абласцях.*

Мы размаўлялі па тэлефоне, і я не ведаў, што мой суразмоўца едзе на аўтамашыне. І тут фермер сказаў, што ён ускочыў у гурбу і паабяцаў перазваніць. Я падумаў, што на гэтым размова наша і скончылася, але праз некалькі хвілін мой мабільнік падаў голас, і я спытаў у Івана Арлоўца:

**— Зіма, дарогі занесеныя, а вы едзеце на легкавушцы, можа, час перасесці на джып?**

*— Усе сродкі я накіроўваю ў вытворчасць. Трэба расшырацца, будаваць сховішча, добра было б узяць крэдыт пад 1,5 працэнта. Можа, праз якія 3 месяцы мне дадуць яго... Дырэктыва паспрыяе.*

Тыя, хто пазнаёміўся з Дырэктывай № 4, прызнаюць, што гэта крок наперад у развіцці прадпрымальніцтва, але выказваюцца насцярожана. Бо невядома, як Дырэктыва будзе рэалізоўвацца — укараняць яе павінны аблвыканкамы і структуры Савета Міністраў, а там могуць не ўлічыць некаторыя важныя моманты, якія ведаюць толькі тыя, хто адведаў хлеба прадпрымальніцтва.

Напрыклад, ці дадуць фермеру, які ў нас заўсёды быў пасынкам, зямлю высокай бальнасці?

Па Ляхавіцкім раёне праходзіць Радзівілаўская града, яна знаходзіцца на тэрыторыі СВК «Жарабковічы». Зямля тут вельмі добрая, і кожны фермер, напэўна, хацеў бы атрымаць надзел у гэтай гаспадарцы, а не ў палескай зоне.

Вось пра гэта я і спытаў у **намесніка старшыні Ляхавіцкага райвыканкама Уладзіміра Дзяжурнага**, бо ён курыруе малы бізнэс у раёне.

*— Зямля належыць сельгаскааператыву, і ёю распараджаецца калектыў гаспадаркі. Калі агульны сход прыме рашэнне...,* — быў адказ.

Можна не сумнявацца, што ніводная гаспадарка не аддасць сваю лепшую зямлю добраахвотна. І правільна зробіць, бо яшчэ невядома, ці ў добрыя рукі яна трапіць. Стаць фермерам жадаюць многія, а становяцца адзінкі.

*— У нас Радзівілаўскай грады няма, і зямля наша нізкай бальнасці. Але калі нехта хоча на ёй пагаспадарыць, то хто супраць?* — сказаў **старшыня Ганцавіцкага райвыканкама Уладзімір Столяр**. *— Дарэчы, некалькі чалавек з суседніх раёнаў жадаюць узяць зямлю, менавіта ў нас. І няхай людзі бяруць. Няхай і жывёлу гадуюць — 20—30 кароў трымаюць... Трэба даць людзям свабоду.*

**— З Дырэктывай вы, напэўна, пазнаёміліся. Ваша думка?**

*— Я думаю, што з ёю мы нават крыху і рыпазніліся. Прадпрымальнікі адкрываюць новыя рабочыя месцы, а для невялікіх райцэнтраў, дзе няма буйных прадпрыемстваў, гэта вельмі актуальна.*

**— А што перашкаджала вам раней даць свабоду прадпрымальнікам і фермерам у сваім раёне?**

*— Адсутнасць закона, бо толькі ад яго можна адштурхоўвацца, прымаючы рашэнне. Але нягледзячы ні на што, сёння ў раёне 500 індывідуальных прадпрымальнікаў і 90 прыватных прадпрыемстваў, якія даюць 13 працэнтаў прыбытку ў раёне. І мы ўжо ад малога бізнэсу не можам адмахнуцца — не прымкмячаць яго.*

У Ляхавіцкім раёне індывідуальных прадпрымальнікаў менш, чым ў Ганцавіцкім — 415 чалавек, а прыватных прадпрыемстваў на 11 больш — 101 адзінка. Гэтыя два раёны — адны з самых невялікіх на Брэстчыне, але, як бачым, прадпрымальніцтва тут развіта.

Нам разам з прыняццем новых законаў неабходна і мяняць адносіны да прадпрымальнікаў у цэлым. Неабходна разбурацца адмоўныя стэрэатыпы, якія ўкараніліся ў грамадстве. А прадпрымальніцкі хлеб цяжкі.

**ХАМУТ**

*Калі пачаў распадацца Саюз, жонка падалася ў ІП, бо не было за што жыць. Бізнэс дробны — кава, шакаладкі, «кіндэр-сюрпрызы»... Але як цяжка даводзілася працаваць! Займалі месца на рынку з 6 раніцы, і да 18 гадзін неабходна было стаяць за прылаўкам. А вечарам да гадзін 22 «падбівалі «бабкі», бо трэба было весці справаздачу перад падатковай інспекцыяй. Тавар везлі з Мінска, Брэста ці Вільні, і ўсё на спіне ці калясцы — знаёмы малюнак тых часоў.*

Але калі сёння многія хочуць прымераць на сябе «хамут» прадпрымальніка, то чаму б іх не падтрымаць і не дапамагчы надзець той хамут — няхай цягнуць свой воз. І не трэба тузаць за лейцы і махаць пугай.

Аднойчы на сустрэчы з фермерамі давялося пачуць:

*— Калі ў вас не будуць паказчыкі такія ж, як у сярэднім па раёне, то зямлю ў вас забяром,* — папярэдзілі фермераў на сходзе ў райвыканкаме.

*— А чаму вы такіх ураджаяў не патрабуеце ад калгасаў, якія знаходзяцца побач з намі?* — абурыліся фермеры.

Сапраўды, чаму занядбанаму калгасу дапамогуць і падтрымаюць яго, бо там калектыў — людзі, а фермера, які стаў банкрутам, ніхто ратаваць не будзе? Гэта ўжо яго праблема. Ці справядліва? Пакінем пытанне адкрытым. Што калгасы? Вунь тэкстыльны камбінат у Баранавічах многія гады высмоктвае з дзяржаўнага бюджэту сотні мільярдаў...

Асабліва мяне ў Дырэктыве насцярожыў пункт 7.2, у якім прапануецца «надаць рэкамендацыйны характар прымяненню Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь».

Я разумею, што прадпрымальнікам патрэбна свабода, але ж не да такой ступені! Мы ўжо вырашылі поўнасцю «расцугляць» іх. Хто абароніць наёмнага работніка, якога прадпрымальнік можа пасадзіць на галодны паёк? Прафсаюзы? Камітэт аховы працы ці нейкая іншая структура? У нас яшчэ пануе дзікі капіталізм!

Вось на мэблевай фабрыцы рабочыя атрымлівалі па 700 тысяч рублёў, а тут зарплата на 100 тысяч упала. Аказалася, што гаспадар фабрыкі вырашыў купіць мікраўтобус «Фальксваген» і з зарплаты кожнага рабочага «адшпіліў» тыя тысячы. Каму скардзіцца? Сёння паскардзіўся, а заўтра — ты беспрацоўны. А дзе ў невялікім райцэнтры знайсці працу?

Не хацелася б усіх прадпрымальнікаў стрыгчы пад адзін грабеньчык, але для большасці з іх свой прыбытак з'яўляецца больш важным, чым справядлівасць пры налічэнні зарплаты сваім работнікам.

Прадпрымальнік — звычайны наш чалавек, хоць больш прагматычны ды з дзелавой хваткай. І пры зручным моманце не выключаю, ён паспрабуе нешта ўхапіць і ў дзяржавы.

Яшчэ раз напомню. Ва Украіне ў свой час прадпрымальнікам далі поўную свабоду, а сёння не ведаюць як іх «зацугляць» — падаткі не плацяць.

Цуглі — гэта не пакаранне, а спосаб утрымання. Так што не будзем на галаву прадпрымальніка ўскладваць цярновы вянок пакутніка. Дзелавая свабода яму неабходная, але і пад кантролем трымаць трэба. Дастаткова паглядзець расійскія тэлеканалы, каб убачыць, што вытвараюць там дзелавыя людзі. Можа, нашы будуць лепшымі?

Дырэктыва — яшчэ не закон, а ўстаноўка Прэзідэнта, указанне, у якім кірунку неабходна рухацца. На аснове палажэнняў гэтай Дырэктывы будуць распрацаваны нарматывы прававых актаў. І тут важна, каб у законах захавалася сутнасць Дырэктывы. А прынятыя законы выконваліся.

Мы едзем па ўхабістай рыначнай дарозе. Дарозе, на якой шмат калдобін ды ям, але ў нас няма выбару і застаецца толькі адно — рухацца наперад.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

«Звязда» ўзняла праблему...

# КАЛІ ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАЕ ДОМАБУДАВАННЕ СТАНЕ Ў БЕЛАРУСІ НОРМАЙ?

**ГЭТАЯ праблема, а таксама пытанні цеплавой аховы ўжо існуючых будынкаў на прыкладзе распрацовак інстытута «Гроднаграмадзянпраект» ставіліся ў артыкуле Уладзіміра Логаша і Барыса Пракопчыка «Батарэі халодныя, а ў кватэры цёпла» («Звязда», 30 лістапада 2010 г.).**
**Хто, дзе, калі і ў якіх маштабах падтрымае ініцыятараў энергаэфектыўнага домабудавання, якое практычна ўжо ў масавым парадку вядзецца ў многіх краінах Заходняй Еўропы і Скандынавіі? Што будзе зроблена ў Беларусі па цеплавой рэабілітацыі старых будынкаў? Вось якія адказы атрымала рэдакцыя.**

**Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, першы намеснік міністра Міхаіл АБРАМЧУК:**

— За апошняе дзесяцігоддзе намеціўся відавочна прагрэс у павышэнні энергаэфектыўнасці будынкаў і зніжэнні ўзроўню цеплавых страт, які дасягаецца за кошт увядзення прагрэсіўных нарматыўных патрабаванняў па цеплавой абароне будынкаў, устаноўкі цеплалічыльнікаў і рэгулятараў цеплазабеспячэння.

Першай сярод краін СНД Беларусь разгарнула будаўніцтва энергаэфектыўных будынкаў, на ацяпленне якіх узровень затрат цяпла ў 2,5-3 разы меншы, чым у астатніх будынкаў. Гэта дасягнута за кошт выкарыстання сучасных канструкцыйна-тэхналагічных рашэнняў і інавацыйнага інжынернага абсталявання (прымусовай прытокава-выцяжной вентыляцыі жылых памяшканняў з рэкуперацыяй да 85 працэнтаў цяпла вентыляцыйных выкідаў, аўтаномных сістэм рэгулявання рэжымаў ацяплення і паветраабмену, аўтаматычнага кліматкантролю ў кожнай кватэры і пакватэрнага ўліку цяпла).

Першы энергаэфектыўны 145-кватэрны дзевяціпавярховы буйнапанэльны жылы дом быў пабудаваны па распрацаваным прадпрыемствам «Інстытут НІПТІС імя Атаева С.С.» праекце ў 2007 годзе ў Мінску. Яго эксплуатацыя ў ацяпляльны перыяд 2007—2009 гадоў пацвердзіла, што фактычна на ацяпленне такога дома расходуецца не больш за 30 працэнтаў ад узроўню цеплавой энергіі, якая спажываецца ў тыпавых дамах. Жыльцы дома актыўна выкарыстоўваюць магчымасці індывідуальнага кіравання параметрамі мікраклімату і выказваюць задавальненне зніжэннем аплаты за ацяпленне, умовамі і камфортнасцю пражывання ў энергаэфектыўным доме.

Пры ўдзеле і навуковым суправаджэнні ДП «Інстытут НІПТІС імя Атаева С.С» інстытутам «Гроднаграмадзянпраект» быў распрацаваны праект энергаэфектыўнага дома са штучных матэрыялаў у Гродне. Аналагічныя жылыя дамы пабудаваныя і здадзеныя ў эксплуатацыю ў Гомелі і Віцебску.

Увогуле ж у энергаэфектыўным выкананні пабудавана жылых дамоў агульнай плошчай: у 2009 годзе — 27,9 тысячы квадратных метраў, за 2010 год — 300 тыс. кв. метраў. Новыя энергаэфектыўныя дамы выкананыя ў розных канструктыўных сістэмах, але агульным для іх з'яўляецца нізкае, каля 30 кВт·г на квадратны метр у год, удзельнае спажыванне энергіі на ацяпленне, што ў тры-чатыры разы менш у параўнанні з аналагічнымі будынкамі тыпавых серый.

Вопыт энергаэфектыўнага будаўніцтва інтэнсіўна распаўсюджваецца ў Беларусі. Прамысловымі прадпрыемствамі рэспублікі асвоены выпуск матэрыялаў, камплектуючых і абсталявання для энергаэфектыўных жылых дамоў: новых канструкцый вокнаў, цеплаабменнікаў-рэкуператараў, вентылятараў, цеплалічыльнікаў, цеплаізалюючых матэрыялаў і іншых.

У 2011 годзе плануецца пабудаваць 600 тыс. кв. метраў энергаэфектыўных жылых будынкаў. А да канца пяцігодкі мяркуецца давесці аб'ём будаўніцтва энергаэфектыўнага жылля да не менш чым 6 мільёнаў кв. метраў у год — 60 працэнтаў ад агульнага аб'ёму жыллёвага будаўніцтва. Пры гэтым на кожным мільёне квадратных метраў энергаэфектыўнага жылля будзе забяспечана эканомія не менш 17,4 тысячы тон умоўнага паліва.

**Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, намеснік міністра Мікалай ЛІПЕНЬ:**

— Рашэнне аб правядзенні цеплавой мадэрнізацыі існуючых жылых дамоў прымаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па выніках абследавання дамоў, зыходзячы з тэхнічнага стану канструкцыйных элементаў будынка, штогадовага аналізу цепласпажывання ў жыллёвым фондзе ў ацяпляльны перыяд, а таксама з улікам зваротаў грамадзян па пытаннях сырасці і прамярзання ў жылых памяшканнях. У першачарговым парадку выконваецца праца па жылых дамах з найбольш нізкімі паказчыкамі энергаэфектыўнасці, а таксама там, дзе маюцца парушэнні тэмпературна-вільготнаснага рэжыму ў жылых памяшканнях.

У 2009 годзе ўвод плошчы пасля цеплавой мадэрнізацыі склаў 576,5 тыс. кв. м, у 2010 годзе — 329,8 тыс. кв. м. Акрамя таго, у 2009 годзе выконваўся капітальны рамонт 514 жылых дамоў, у тым ліку з прывядзеннем агароджвальных канструкцый да патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў — 152, у 2010 годзе такім чынам адрамантавана 85 дамоў.

Выкананне цеплавой мадэрнізацыі агароджвальных канструкцый жылых дамоў дазваляе знізіць энергастраты, зменшыць спажыванне цеплавой энергіі на ацяпленне, палепшыць спажывецкія характарыстыкі і павысіць камфортнасць жылых памяшканняў, а таксама эканоміць сродкі на энергазбяржэнне будынкаў пры далейшай іх эксплуатацыі. Аналіз цепласпажывання паказвае, што пасля капітальнага рамонту і цеплавой мадэрнізацыі жылых дамоў спажыванне цеплавой энергіі зніжаецца на 20-30 працэнтаў.

Праца па цеплавой мадэрнізацыі жыллёвага фонду з прывядзеннем цеплатэхнічных характарыстык агароджвальных канструкцый да нарматыўных патрабаванняў будзе працягнута.

**Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, першы намеснік дырэктара Віктар АКУШКА:**

— Павышэнне энергаэфектыўнасці, у тым ліку пры будаўніцтве і эксплуатацыі жылых і грамадскіх будынкаў, з'яўляецца вельмі актуальным для Беларусі і ўваходзіць у лік прыярытэтных напрамкаў, вызначаных Рэспубліканскай праграмай энергазбяржэння на 2006—2010 гады.

Патрабаванні заканадаўства па каэфіцыентах тэрмічнага супраціўлення цеплапераданчы пастаянна ўдасканальваюцца і павялічваюцца. Новыя каэфіцыенты зацверджаны для прымянення пры праектаванні з 1 ліпеня 2010 года і пры будаўніцтве з 1 студзеня 2011 года. Такім чынам, урадам прымаюцца неабходныя меры па павышэнні энергаэфектыўнасці ў гэтай сферы.

Штогод у рэспубліцы выконваюцца мерапрыемствы па цеплавой рэабілітацыі каля 450 тысяч квадратных метраў агароджвальных канструкцый будынкаў, у тым ліку ў рамках рэалізацыі абласных і г. Мінска праграм энергазбяржэння і сумесных праектаў з Міжнародным банкам рэканструкцыі развіцця. У выніку правядзення мерапрыемстваў па павелічэнні тэрмасупраціўлення агароджвальных канструкцый будынкаў, збудаванняў і жыллёвага фонду, напрыклад, у 2009 годзе атрыманы эканамічны эфект на ўзроўні 44,8 тысячы тон умоўнага паліва (па звестках дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці 4-Энергазбяржэнне).

Разам з тым, на падставе аналізу звестак гэтай статыстыкі тэрмін акупляльнасці мерапрыемстваў па цеплавой рэабілітацыі будынкаў складае 15-30 гадоў.

Інфармацыя аб указаных у артыкуле газеты «Звязда» «Батарэі халодныя, а ў кватэры... цёпла» тэрмінах акупляльнасці падобных мерапрыемстваў на ўзроўні трох-пяці, а ў перспектыве аднаго-

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У КРЫМІНАЛЬНЫ І КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКСЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі*

*2 снежня 2010 года*
*10 снежня 2010 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2003 г., № 8, 2/922; № 83, 2/974; 2006 г., № 6, 2/1179; 2007 г., № 291, 2/1385; 2008 г., № 184, 2/1514; 2009 г., № 173, 2/1594; 2010 г., № 16, 2/1651) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Частку 3 артыкула 44 і частку 1 артыкула 62 пасля слова «ўрону,» дапоўніць словамі «даходу, атрыманага злачынным шляхам,».

2. Частку 6 артыкула 61 пасля слова «шляхам,» дапоўніць словамі «даходу, атрыманага ад выкарыстання гэтай маёмасці,».

3. У пункце 4 часткі 1 артыкула 63 словы «добраахвотнае пакрыццё ўрону» замяніць словамі «добраахвотныя кампенсацыя ўрону, плата даходу, атрыманага злачынным шляхам».

4. Артыкул 66 дапоўніць часткай 3 наступнага зместу:

«3. Пакаранне арганізатару (кіраўніку) арганізаванай групы можа быць прызначана без уліку абмежаванняў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула, у выпадку поўнай кампенсацыі ім урону, нанесенага дзяржаве, юрыдычным або фізічным асобам, або шкоды дзяржаўным або грамадскім інтарэсам, або платы даходу, атрыманага злачынным шляхам, калі ўчыненае злачынства не было звязана з замахам на жыццё або здароўе чалавека.».

5. Частку 1 артыкула 69 пасля слоў «і 4» і «віду» дапоўніць адпаведна словамі «часткі 1» і «асноўнага».

6. Частку 2 артыкула 77 дапоўніць словамі «, плаце даходу, атрыманага злачынным шляхам».

7. Частку 1 артыкула 86 пасля слова «ўрон» дапоўніць словамі «, або якая аплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам,».

8. У частцы 1 артыкула 88 словы «ўрон або» замяніць словамі «ўрон, або аплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам, або».

9. У артыкуле 88[1]:

назву артыкула выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 88[1]. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з добраахвотнымі кампенсацыяй нанесенага ўрону (шкоды), аплатай даходу, атрыманага злачынным шляхам»;**

частку 1 пасля слова «(шкода),» дапоўніць словамі «аплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам,».

10. У частцы 5 артыкула 90:

слова «трэцяй» замяніць лічбай «3»;

дапоўніць частку другім сказам наступнага зместу: «На асуджанага, які не кампенсаваў урон (шкоду), нанесены злачынствам, не аплацію даход, атрыманы злачынным шляхам, суд можа таксама ўскласці абавязак цалкам або часткова кампенсаваць такі ўрон (шкоду), заплаціўшы такі даход на працягу тэрміну неадбытай часткі пакарання, якая засталася.».

11. У пункце 4 часткі 2 артыкула 115 слова «пятнаццаці» замяніць словам «дванаццаці».

12. У абзацы першым часткі 1 артыкула 235 словы «выкарыстанне названых матэрыяльных каштоўнасцяў» замяніць словамі «а роўна выкарыстанне названых матэрыяльных каштоўнасцяў або атрыманага ад іх даходу».

13. Абзац першы часткі 2 артыкула 281 пасля слоў «Незаконная здабыча рыбы або іншых водных жывёл,» дапоўніць словамі «ўчыненая асобай, раней судзімай за злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, або».

14. Абзац першы часткі 2 артыкула 282 пасля слоў «або незаконнае паляванне,» дапоўніць словамі «ўчыненае асобай, раней судзімай за злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, або».

15. У назве, абзацы першым часткі 1 і абзацы першым часткі 2 артыкула 301 словы «, звязаных з выкарыстаннем ядзернай» замяніць словамі «выкарыстання атамнай».

16. Абзац другі часткі 1 артыкула 459 пасля слова «караюцца» дапоўніць словамі «штрафам або».

17. Абзац другі артыкула 461 пасля слова «караюцца» дапоўніць словамі «штрафам, або».

18. Абзац другі артыкула 462 пасля слова «караецца» дапоўніць словамі «штрафам, або».

19. У артыкуле 464:

абзац другі часткі 1 пасля слова «караецца» дапоўніць словамі «штрафам, або»;

абзац другі часткі 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«караецца абмежаваннем па вайсковай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.».

**Артыкул 2.** Унесці ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 77—78, 2/71; № 47, 2/152; 2003 г., № 8, 2/922; 2006 г., № 92, 2/1219; 2008 г., № 1, 2/1394; № 14, 2/1412; 2009 г., № 173, 2/1594; 2010 г., № 14, 2/1659) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У пункце 13 артыкула 6, часткі 2 артыкула 181 і часткі 1 артыкула 451 словы «псіхічнай хваробай» і «псіхічнай хваробы» замяніць адпаведна словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем)» і «псіхічнага расстройства (захворвання)».

2. З пунктаў 2 і 3 часткі 6 артыкула 46 словы «падазронага,» і «які падазраецца,» выключыць.

3. У частцы 2 артыкула 127 словы «або іншай лячэбнай установе» і «гэтыя ўстановы» замяніць адпаведна словамі «ўстанове, іншай дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя» і «гэта ўстанова (гэтую дзяржаўную арганізацыю)».

4. Частку 4 артыкула 130 пасля слова «хворыя» дапоўніць словам «асобы».

5. У артыкуле 132:

у частцы 1 словы «выканання прыгавору ў частцы» замяніць словамі «пакрыццё ўрону (шкоды), нанесенага злачынствам, аплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам,»;

частку 8 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«8. Накладанне арышту на маёмасць адмяняецца пастановай (прысудам) органа, у вытворчасці якога знаходзіцца крымінальная справа, калі ў гэтай меры адпадае неабходнасць. Пастанова (прысуд) аб накладанні арышту на маёмасць можа быць таксама адменена ў выпадку заявы падазроным, абвінавачваным або асобамі, якія нясуць згодна з законам матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні, хадайніцтва аб вызваленні маёмасці ад арышту для яе рэалізацыі ў мэтах пакрыцця ўрону (шкоды), нанесенага злачынствам, аплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, іншых маёмасных спагнанняў пад кантролем органа, у вытворчасці якога знаходзіцца крымінальная справа. Парадак рэалізацыі такой маёмасці вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.».

6. Частку 2 артыкула 139 пасля слоў «крымінальнай справы, крымінальнага пераследавання» дапоўніць словамі «, аб адмаўленні ў завядзенні вытворчасці па абставінах, якія зноў адкрыліся».

7. У артыкуле 142:

частку 2 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Прынятае пракурорам рашэнне можа быць абскаржана вышэйстаячаму пракурору, які абавязаны разгледзець скаргу на крымінальнай справе, што знаходзіцца ў вытворчасці органа дазнання, дазнавальніка, следчага на працягу дзесяці сутак, а ў астатніх выпадках — не пазней за адзін месяц з дня яе паступлення.»;

частку 3 пасля слоў «крымінальнага пераследавання» дапоўніць словамі «, адмаўленне ў завядзенні вытворчасці па абставінах, якія зноў адкрыліся»;

частку 5 пасля слоў «спыненне папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання» і «аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання» дапоўніць адпаведна словамі «, адмаўленне ў завядзенні вытворчасці па абставінах, якія зноў адкрыліся» і «, аб адмаўленні ў завядзенні вытворчасці па абставінах, якія зноў адкрыліся»;

у частцы 6:

пасля слоў «крымінальнага пераследавання» дапоўніць словамі «, адмаўленне ў завядзенні вытворчасці па абставінах, якія зноў адкрыліся»;

словы «чацвёртай» і «вышэйстаячы суд» замяніць адпаведна лічбай «4» і словамі «адпаведнасці з правіламі главы 42 гэтага Кодэкса».

8. Назву главы 19 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«ГЛАВА 19**
**ЗЛУЧЭННЕ, ВЫДЗЯЛЕННЕ І АДНАЎЛЕННЕ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ».**

9. У артыкуле 164:

у першым сказе часткі 1:

словы «а таксама» выключыць;

дапоўніць сказ словамі «, а таксама справы, заведзеныя па факце знікнення асобы, і аб грамадска небяспечным дзеянні, прадугледжаным крымінальным законам, звязаным са знікненнем гэтай асобы»;

дапоўніць артыкул часткай 1[1] наступнага зместу:

«1[1]. Злучэнне крымінальных спраў дапускаецца ў выпадках, калі асобы, якія падлягаюць прыцягненню ў якасці абвінавачваных (падазроных), не вызначаны, але існуюць дастатковыя падставы меркаваць, што некалькі злачынстваў учыненыя адной асобай або групай асоб.».

10. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 165[1] наступнага зместу:

**«Артыкул 165[1]. Аднаўленне крымінальных спраў**

1. Аднаўленне страчанай крымінальнай справы або яе асобных матэрыялаў ажыццяўляецца згодна з пастановай начальніка следчага падраздзялення, начальніка органа дазнання, пракурора, а ў выпадку страты крымінальнай справы або яе матэрыялаў у працэсе судовай вытворчасці — згодна з прысудам (пастановай) суда.

2. Аднаўленне крымінальнай справы ажыццяўляецца па прадметах, якія захаваліся, копіях дакументаў, якія могуць быць прызнаны доказамі ў парадку, вызначаным гэтым Кодэксам, і шляхам правядзення следчых і іншых працэсуальных дзеянняў.

3. Тэрміны вытворчасці дазнання, папярэдняга следства, утрымання пад вартай і дамашняга арышту пры аднаўленні крымінальнай справы вылічваюцца ў парадку, вызначаным артыкуламі 125, 127, 188 і 190 гэтага Кодэкса.».

11. Пункт 1 артыкула 177 пасля слова «справа» дапоўніць словамі «ніжэйстаячаму пракурору,».

12. У артыкуле 189 словы «дванаццатай» і «псіхічнай хваробай» замяніць адпаведна лічбамі «12» і словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем)».

13. Артыкул 199 дапоўніць словамі «з дня атрымання прысуду».

14. Артыкул 207 дапоўніць часткай 1[1] наступнага зместу:

«1[1]. Следчы эксперымент у жыллі і іншым законным уладанні праводзіцца толькі са згоды ўласніка або паўналетніх асоб, якія ў іх пражываюць, або згодна з пастановай следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора або яго намесніка, якая павінна быць прад'яўлена да пачатку следчага эксперыменту, і з удзелам панятых.».

15. Артыкул 225 дапоўніць часткай 1[1] наступнага зместу:

«1[1]. Праверка паказанняў у жыллі і іншым законным уладанні праводзіцца толькі са згоды ўласніка або паўналетніх асоб, якія ў ім пражываюць, або згодна з пастановай следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора або яго намесніка, якая павінна быць прад'яўлена да пачатку праверкі паказанняў на месцы.».

16. Артыкул 235 дапоўніць часткай 3 наступнага зместу:

«3. Час знаходжання падазронага або абвінавачванага ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя ўключаецца ў тэрмін утрымання пад вартай.».

17. У пункце 1 часткі 5 артыкула 242 словы «хвароба, якая пазбаўляе» замяніць словамі «захворванне, якое пазбаўляе».

18. У пункце 4 часткі 1 артыкула 246 і пункце 2 часткі 1 артыкула 280:

пасля слова «псіхічнага» дапоўніць пункты словамі «расстройства (захворвання)»;

словы «які перашкаджае» і «засведчанага» замяніць адпаведна словамі «якія перашкаджаюць» і «засведчаных».

19. Артыкул 301 дапоўніць часткай 3[1] наступнага зместу:

«3[1]. У выпадку аб'яднання судом крымінальных спраў па абвінавачанні адной і той жа асобы ва ўчыненні некалькіх злачынстваў дзяржаўны абвінаваўца пры прад'яўленні абвінавачання ў парадку, вызначаным часткай 2 гэтага артыкула, абавязаны скласці новую пастанову аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачванага з апісаннем усіх злачынстваў, якія інкрымінуюцца абвінавачванаму.».

20. У артыкуле 302:

у частцы 2:

пасля слова «псіхічнага» дапоўніць частку словамі «расстройства (захворвання)»;

словы «які выключае» замяніць словамі «якія выключаюць»;

частку 3 пасля слова «псіхічнага» дапоўніць словамі «расстройства (захворвання)».

21. У частцы 2 артыкула 353 і часткі 1 артыкула 442 словы «псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе».

22. Пункт 7 часткі 1 артыкула 361 дапоўніць словамі «або іншую дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя».

23. У частцы 7 артыкула 399 і частцы 4 артыкула 402[2] слова «хваробе» замяніць словам «захворванню».

24. У артыкуле 402:

другі сказ часткі 1 дапоўніць словамі «, а таксама спаганяюцца працэсуальныя выдаткі, калі яны не былі спагнаныя пры вынясенні прысуду»;

у частцы 2 слова «хваробе» замяніць словам «захворванню».

25. Артыкул 408 дапоўніць часткай 3 наступнага зместу:

«3. Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь і іх намеснікам скарга ў парадку нагляду на прыгавор, прысуд, пастанову суда можа быць пададзена ў выпадку пакідання яе без задавальнення старшынямі абласных, Мінскага гарадскога, Беларускага ваеннага судоў, пракурорамі абласцей, горада Мінска і прыраўнаванымі да іх пракурорамі.».

26. З часткі 1 артыкула 411 словы «пятнаццаці сутак, а Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — не пазней» выключыць.

27. Частку 5 артыкула 420 дапоўніць словамі «або ў суд».

28. У артыкуле 443:

у частцы 1 словы «псіхічнай хваробай» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем)»;

у пункце 3 часткі 2 слова «захворвання» замяніць словамі «расстройства (захворвання)».

29. Частку 4 артыкула 444 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Пры спыненні вытворчасці па крымінальнай справе на падставе, названай у частках 2 і 3 гэтага артыкула, копія прысуду (пастановы) суда ў пяцідзённы тэрмін накіроўваецца ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства дадзенай асобы або ўпраўленне аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта (камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) для вырашэння пытанняў аб аказанні медыцынскай дапамогі або аб накіраванні ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) установу.».

30. У артыкуле 447:

у пункце 4 словы «псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе»;

у пункце 5 слова «захворванне» замяніць словамі «расстройства (захворванне)».

31. У артыкуле 448:

у частцы 1 словы «псіхічнай хваробай, якая робіць» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое робіць»;

частку 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Пры спыненні вытворчасці па крымінальнай справе на падставе, названай у частках 2 і 3 гэтага артыкула, копія прысуду (пастановы) суда ў пяцідзённы тэрмін накіроўваецца ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства дадзенай асобы або ўпраўленне аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта (камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта), следчы або пракурор у пяцідзённы тэрмін у пісьмовай форме паведамляюць пра яе ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства дадзенай асобы або ўпраўленне аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта (камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) для вырашэння пытанняў аб аказанні медыцынскай дапамогі або аб накіраванні ў псіхіятрычную (псіханеўралагічную) установу.».

32. У частцы 1 артыкула 450 словы «ўстановы, якая аказвае псіхіятрычную дапамогу,» замяніць словамі «псіхіятрычнай (псіханеўралагічнай) установы».

**Артыкул 3.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у чатырохмесячны тэрмін:

вызначыць парадак рэалізацыі маёмасці, вызваленай ад арышту органам, які вядзе крымінальны працэс, у мэтах кампенсацыі ўрону (шкоды), нанесенага злачынствам, аплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, іншых маёмасных спагнанняў;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 4.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 3, якія ўваходзяць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона, а таксама пункта 5 артыкула 2, які ўваходзіць у сілу праз чатыры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*27 снежня 2010 года, г. Мінск.*
*№ 223-З*

**Тэкст з'яўляецца неафіцыйным перакладам Закона.**

**Афіцыйнае апублікаванне ажыццяўляецца ў афіцыйным перыядычным выданні «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь».**

## Купляй сваё!

# ТРЫ СОТНІ ЛЕПШЫХ!

**Як паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, ганаровага звання «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» удастоіліся па выніках 2010 года 312 тавараў 189 айчынных арганізацый і прадпрыемстваў.**

Конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» праводзіцца штогод па сумеснай ініцыятыве Дзяржстандарта, абласных выканаўчых камітэтаў і Мінгарвыканкама. Прымаць удзел у ім могуць як юрыдычныя асобы, незалежна ад формы ўласнасці, так і індывідуальныя прадпрымальнікі. У Дзяржстандарце з задавальненнем адзначаюць, што ў конкурсным руху актыўна ўдзельнічаюць арганізацыі малога і сярэдняга бізнэсу, якія прапануюць канкурэнтаздольную, у тым ліку і імпартазамяшчальную, прадукцыю. Па выніках прайшоўшага года гэта асабліва характэрна для прадпрыемстваў, якія выпускаюць прамысловыя тавары для насельніцтва — такіх, як «Дзіліс Касметык» (туалетныя воды серыі « Atlantica»), «Кондар» (водна-дысперсійная грунтоўка), «Вікторыя» (жароўні літыя алюмініевыя), «Ромгіль» (трыкатажныя вырабы для жанчын з высокім утрыманнем воўны), «Свіцянак» і «Актамір».

У 2010 годзе конкурс прайшоў у краіне ўжо ў дзявяты раз. Традыцыйна найбольш прадстаўнічай на конкурсе аказалася намінацыя «Харчовыя тавары», дзе лепшымі былі прызнаныя 190 найменняў прадукцыі 95 айчынных прадпрыемстваў. Многія беларускія прадпрыемствы бяруць удзел у конкурсе літаральна кожны год і кожны год у даволі жорсткай канкурэнцыі перамагаюць . Гэта такія прадпрыемствы, як ААТ «Савушкін прадукт», ААТ «Маларыцкі кансерва-гароднінасушыльны камбінат», ААТ «Пастаўскі малочны завод», ААТ «Беллакт», СП ААТ «Спартак», Гарадскі малочны завод № 1 (г. Мінск), САТ «Камунарка», ААТ «Барысаўскі мясакамбінат», ААТ «Бабулін гладыш» і іншыя. Сёння павышаным попытам у пакупнікоў карыстаюцца прадукты здаровага харчавання. Улічваюць гэтую тэндэнцыю і айчынныя вытворцы. Так, сярод пераможцаў конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» ёсць адразу некалькі тавараў гэтай лініі — шматкі зародкавыя пшанічныя Баранавіцкага камбіната хлебапрадуктаў, хлеб з цэльнага зерня «Аматарскі» «Гомельхлебапрама», пячэнне «Амега» з фруктозай і пшанічным вотруф'ем «Брэстхлебапрама», біяёгурты і біянапіткі Полацкага малочнага камбіната, Бярозаўскага сыраробнага камбіната, ААТ «Бабулін гладыш» і іншыя.

Другой па актыўнасці прэтэндэнтаў на званне «лепшага» аказалася намінацыя «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння», у якой былі вызначаны 62 тавары-пераможцы, і намінацыя «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных рамёстваў» ( 59 пераможцаў).

А ў намінацыі «Навінка года» ганаровае званне было прысуджана 22 таварам рознага прызначэння. Гэтая намінацыя была заснавана спецыяльна з мэтай стымулявання выпуску ў краіне новых відаў прадукцыі з палепшанымі характарыстыкамі і прымяненнем сучасных тэхналогій і матэрыялаў.

Арганізацыі, якія ўдастоіліся звання лаўрэата, атрымаюць права размяшчаць лагатып конкурсу на сваіх таварах і ўпакоўцы, а таксама ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРІОРБАНК: СУЧАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ БЯСПЕКІ

**ПРІОРБАНК стаў першым беларускім банкам, які атрымаў сертыфікат адпаведнасці стандарту бяспечнасці звестак плацежных картак.**

Адпаведнасць банка гэтаму стандарту, паведамілі карэспандэнту газеты ў «Пріорбанк» ААТ, пацвердзіла аўдытарская кампанія Security Research & Consulting GmbH (SRC, Германія) па выніках PSI DSS аўдыту ў снежні мінулага года. Дарэчы, згаданы стандарт распаўсюджваецца не толькі на працэсінгавыя і сеткавыя рашэнні, але і на забеспячэнне фізічнай бяспекі звестак. Ён утрымлівае патрабаванні ў наступных галінах: збудаванне і падтрыманне бяспечнай сеткі, абарона звестак плацежных картак, рэалізацыя праграмы кіравання прыступнасці, рэалізацыя захадаў па строгім кантролі доступу, рэгулярны маніторынг і тэсціраванне сетак, падтрыманне палітыкі інфармацыйнай бяспекі. Такі ўсебаковы падыход да абароны канфідэнцыяльнай інфармацыі сёння з'яўляецца найбольш эфектыўным спосабам абароны ад злачынстваў, якія ўчыняюцца ў карткавай сферы. Аўдзітары кампаніі SRC адзначаюць, што дзякуючы праведзенай у Пріорбанку працы адбыліся істотныя змены ў падыходах да вядзення бізнэсу. У прыватнасці, унесены неабходныя змены ў IT-працэсы, праца ўсіх дадаткаў і іх карыстальнікаў старанна пратакаліруецца, доступ да звестак картрахункаў абмежаваны і даецца толькі ў выпадку неабходнасці, праводзіцца рэгулярнае тэсціраванне сістэм і працэсаў забеспячэння бяспекі. Паводле слоў члена праўлення «Пріорбанка» ААТ Сяргея Шышова, атрыманне сертыфіката адпаведнасці патрабаванням PSI DSS азначае, што банк дабіўся сучаснага ўзроўню бяспекі, і яго кліенты і партнёры могуць быць упэўненыя ў надзейнасці работы Пріорбанка. Ён падкрэсліў, што Пріорбанк з'яўляецца высокатэхналагічным банкам, які прапануе шмат сучасных паслуг у сферы карткавага бізнэсу, таму клопат пра абарону персанальнай інфармацыі трымальнікаў картак з'яўляецца адным з асноўных прыярытэтаў банка.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Ну і ну!

### Захацеў сапраўдных грошай за... сувенірную банкноту

**У Воранаўскім раёне 18-гадовы хлопец паспрабаваў абмяняць у мясцовым аддзяленні банка сувенірную банкноту, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Такія «грошы» прадаюцца ў многіх гандлёвых пунктах і адрозніць іх ад арыгіналу не складае праблемы. Тым не менш юнак разлічваў, што моцна пакамечаная купюра наміналам 200 еўра пойдзе на абмен як сапраўдная. Аднак не атрымалася: касір лёгка разгадаў злачынны намер маладога чалавека і выклікаў міліцыю. Заведзена крымінальная справа ў сувязі са спробай махлярства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### Аматары дармавых парасят

Тры мужчыны заработалі на тым, што неаднаразова з селекцыйнага цэнтра ў Аршанскім раёне кралі свінак. Спачатку два з іх падабралі ключы і з цэха цэнтра скралі шэсць парасят. У наступны раз залезлі ў памяшканне з малымі свінкамі і спрабавалі скрасці яшчэ дзесяць. Ды вартаўнік іх своечасова заўважыў, і давялося бегчы без здабычы. Потым ужо пайшлі «тройкай» і скралі восем парасят. Падчас следства прызналіся, што прадавалі свінак грамадзянам у суседнім Дубровенскім раёне.

Як расказаў «Звяздзе» **Міхаіл САШЧЭКА, пракурор аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па наглядзе за расследаваннем крымінальных спраў у органах пракуратуры**, два з трох аматараў красці свінак раней судзімыя за крадзяжы. Адзін з іх неаднаразова. Ён атрымаў 10 месяцаў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі строгага рэжыму. Яшчэ аднаго арыштавалі на 4 месяцы, трэцяга прыгаворам суда пакаралі абмежаваннем волі на 1 год і 3 месяцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### З кім звязаўся?

Заведзена крымінальная справа супраць педагога Пінскага каледжа. Трое навучэнцаў за станоўчую адзнаку па дысцыпліне «Тэхналогія матэрыялаў» разлічыліся з педагогам вертыкальным свідравальным станком, які каштаваў 219650 рублёў. На маёмасць педагога коштам 5 млн накладзены арышт.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## 14 февраля 2011 года

**в 10.00 в зале заседаний исполкома (4-й этаж), расположенного по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22,**
**проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, в 11.00 – открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.**

**На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Колхозная | 0,0150 | 625650100005000430 | 374 920 | 1 635 337 |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Партизанская | 0,0064 | 625650100003001457 | 331 750 | 643 318 |

Целевое назначение участков – для установки и обслуживания торгового павильона. Участок свободен от строений. Инженерные коммуникации: имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды земельного участка – 25 лет.

**На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:**

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Дещенский с/Совет | Земельный участок: д. Городище, ул. Центральная, 18А | 0,1500 | 625682502601000019 | 12 000 000 | 705 692 |
| Лот № 2 | Дещенский с/Совет | Земельный участок: д. Рябиновка, ул. Рябиновая. Участок № 39 | 0,1501 | 625682509601000045 | 5 000 000 | 742 258 |

К участку, расположенному по адресу д. Городище Дещенского сельского Совета, имеется возможность подключения к газоснабжению и водоснабжению, в д. Рябиновка отсутствуют все инженерные коммуникации.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 206, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 14 января по 8 февраля 2010 года включительно.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 10.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 55404, 54705, 55338.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9**

**Аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Функциональное назначение земельного участка | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006269, площадью 0,0535 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Социалистическая 4-я, 16/18 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, охранная зона тепловых сетей. | 12 026 586 | 1 202 600 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет |

Дата, время и место проведения аукциона: 04.02.2011 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 31.01.2011 г. до 17.30.

**Аукционы по продаже права заключения договоров аренды земельных участков**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, предлагаемого в аренду | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 240155400001000366, площадью 0,0340 га, расположенный по адресу: Витебская область, г. Витебск, г.п. Руба, ул. Центральная. (Повторный аукцион) | Под строительство объекта «Физкультурно-оздоровительный комплекс в районе жилой застройки по улице Центральной в городском поселке Руба». Срок аренды 55 лет. | Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения и водоотведения. Ограничения в использовании: водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос реки Западная Двина. | 2 721 503 | 272 100 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 240155400001000367, площадью 0,0450 га, расположенный по адресу: Витебская область, г. Витебск, г.п. Руба, ул. Центральная. (Повторный аукцион) | Под строительство объекта «Магазин продовольственных и непродовольственных товаров по улице Центральной в городском поселке Руба». Срок аренды 55 лет. | Возможность подключения централизованного газо-, водоснабжения и водоотведения. Ограничения в использовании: водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос реки Западная Двина. | 3 806 661 | 380 600 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет |

Дата, время и место проведения аукциона: 25.02.2011 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 21.02.2011 г. до 17.30.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221285900001000195, площадью 1,0000 га, расположенный по адресу: Витебская область, Витебский район, Мазоловский с/с, У-100. | Для строительства и обслуживания объекта производственного назначения – производства древесного угля путем томления в УП (EURO) с дожигом пиролизных газов. Срок аренды 50 лет. | Возможность подключения централизованного водоснабжения и водоотведения. Наличие асфальтированного подъезда. Ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В. | 5 015 815 | 501 500 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: фин. отдел Витебского райисполкома |

Дата, время и место проведения аукциона: 17.02.2011 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 11.02.2011 г. до 17.30.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, д. 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

**Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:**

- возместить затра

# Лепшыя беларускія кнігі 2010 года

Дзённік бландзінкі

У дзяцінстве мне здавалася, што пісьменнікі — гэта нейкія выключныя людзі, якія і ведаюць больш, і адчуваюць больш тонка, чым другія. Але прафесія крытыка пераконвае мяне ў тым, што далёка не ўсе, хто прымервае на сябе пісьменніцкія лаўры, насамрэч з'яўляюцца пісьменнікамі. Інакш як вытлумачыць той факт, што робячы гадавыя рэйтынгі беларускіх выданняў, увесь час сутыкаюся з хранічнай адсутнасцю такога мастацкага твора, які б захацелася абвясціць бясспрэчным бестселерам, кнігай абавязковай для пакупкі і прачытання? І ўсё ж варта назваць імёны тых, хто парадаваў.

**САМАЯ АРЫГІНАЛЬНАЯ КНІГА ГОДА** — ***«Ладдзя роспачы» Ул. КАРАТКЕВІЧА.*** Гэта сапраўды ўнікальная кніга! У ёй можна пабачыць сам рукапіс, чарнавыя накіды, невядомыя фотаздымкі Караткевіча, а таксама тыя 296 правак, якія зрабілі цэнзары ў невялікім, але бліскучым творы класіка прыгодніцкага жанру за савецкім часам. Ідэя выдання такой кнігі цалкам належыць ***Глебу ЛАБАДЗЕНКУ,*** які, да ўсяго, арганізаваў збор сродкаў на такі ўнікальны праект. Дарэчы, гэта ўжо не першы выпадак, калі малады паэт і журналіст атрымлівае народную дапамогу на свае добрыя справы. На мой погляд, няма нічога важнейшага ў літаратуры, чым жывая сувязь пісьменнікаў і чытачоў.

**ЛЕПШАЯ КНІГА ПРОЗЫ** — ***«П'яўка» Юрыя СТАНКЕВІЧА,*** напісаная ў жанры раман-папярэджанне. Той, хто ўжо сутыкаўся з антыўтопіямі гэтага аўтара, адчуе пэўнае дэжавю. Бо вобразы Сімуляцыі, Еўрабіі, Мегаполіса, квазіолоэў і працаробаў ужо не раз з'яўляліся на старонках твораў гэтага пісьменніка, у тым ліку і ў яго апошніх «Эрыніях». На мой погляд, Станкевіч — тыповая ахвяра футуролагаў з іх постапакаліптычнымі застрашваннямі. Але піша ён вострую, актуальную прозу з займальным сюжэтам. І хоць, на мой густ, яго тэксты перагружаныя навуковымі і псеўданавуковымі фактамі, расісцкімі і гомафобнымі выпадамі, але, прынамсі, ён адзіны, хто не баіцца зазірнуць у будучыню. На тле інфантыльных пісак-«элояў», Станкевіч — чорнарабочы заўтрашняй літаратуры.

**ЛЕПШАЯ КНІГА ПРОЗЫ ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ** — ***«Урокі першага кахання» Валерыя ГАПЕЕВА.*** Тры аповесці, якія ўвайшлі ў кнігу, цяжка, безумоўна, параўноўваць з нашумелай «Школай» Валерыі Гай Германікі, але, тым не менш, чытво атрымалася яркім, цікавым, актуальным. Як чалавек, які пачынаў працаваць настаўніцай у звычайнай сярэдняй школе, я рэкамендавала б гэты твор для абмеркавання на ўроках пазакласнага чытання. Кніга будзе карысная і бацькам, і настаўнікам — не толькі як мажлівасць успомніць, што сённяшнія падлеткі жывуць па законах даруслага жорсткага свету, але і дзякуючы невялічкаму слоўніку, у якім тлумачацца паняцці свету віртуальнага. Адзіным мінусам выдання з'яўляецца яго «недзіцячы» кошт.

**ЛЕПШАЯ КНІГА ПРОЗЫ ДЛЯ АМАТАРАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ** — ***«Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды» Ігнацыя ЯЦКОЎСКАГА.*** Каб адкрыць аўтарства «Аповесці з майго часу...», літаратуразнаўцам спатрэбілася сорак гадоў. Ігнацы Яцкоўскі — 36-гадовы навагрудскі адвакат, які вясною 1831 года далучыўся да Літоўскага паўстання, вынікам чаго стала 25 гадоў эміграцыі. «Аповесць...», напісаную на пачатку 50-х гадоў XIX ст., можна лічыць гістарычным творам, бо мастацкі час пачынаецца ў канцы XVIII ст., а заканчваецца падзеямі ў знакамітым Крашыне 1828 года. Асноўная сюжэтная лінія заснаваная на сямейна-побытавай драме з прыгодніцкімі элементамі. У «Аповесці...» шмат успамінаў пра чутае і бачанае аўтарам, але гэта не мемуары, а, хутчэй, лірычныя адступленні, якія ствараюць каларыт той эпохі, у якую жывуць героі. Пераклад, пасляслоўе і каментар зроблены Міколам Хаўстовічам.

**ЛЕПШЫ ПРАЗАІЧНЫ ДЭБЮТ** — ***кніга Наталкі ХАРЫТАНЮК «Трынаццаць гісторый пра мёртвага ката».*** Самае неверагоднае ў гэтым выданні тое, што маладая аўтарка дэбютавала ў такім складаным жанры, як філасофская проза. Так, ведаю — гэты жанр «на аматара»... «Трынаццаць гісторый...» — кніга пра «здзіўленне, якое не вымагае ніякіх пошукаў і тлумачэнняў»... Пра тое, чаму «перамога не адрозніваецца ад паразы»... Пра загадкі, знікненні і тайны, якія адбываюцца адно ў размовах двух любячых людзей. Адзінай праблемай гэтых філасофскіх дыялогаў застаецца герметычнасць прасторы, на якой жывуць і спрачаюцца інтэлектуальна заклапочаныя персанажы кнігі... Але калі вы любіце прозу цяжкую для разумення, але лёгкую і нават зграбную па форме, то гэтая кніга для вас.

**ЛЕПШЫЯ КНІГІ ПАЭЗІІ** — ***«Новае неба» Адама ГЛОБУСА і «Несымэтрычныя сны» Андрэя ХАДАНОВІЧА.*** Гэтыя аўтары застаюцца лідарамі чытацкіх сімпатый, але яны настолькі рознія, што цяжка выбраць паміж імі. Глобус у «Новым небе» прадстаўляе як вершы ранейшай пары, так і зусім новыя, але і тыя, і другія напісаны ў класічным для нашай літаратуры ключы. Хадановіч у новай кнізе чарговы раз пацвярджае сваю славу наватара.

**ЛЕПШАЯ НАВУКОВАЯ КНІГА,** якая будзе цікавай не толькі гісторыкам-прафесіяналам, — шасцісотстаронкавы фаліянт ***Наталлі ГАРДЗІЕНКІ «Беларусы ў Вялікабрытаніі».*** Сваёй задачай даследчыца бачыла найбольш шырокае асвятленне разнастайных формаў і праяваў беларускага жыцця ў згаданай краіне і, у першую чаргу, гісторыі беларускіх арганізацый — грамадскіх, культурна-асветных, рэлігійных, вайсковых. Дзякуючы тытанічнай працы ў архівах, якую правяла Гардзіенка, чытач мае магчымасць адчуць унікальную атмасферу, у якой нашы былыя суайчыннікі змагаліся за захаванне і папулярызацыю нашай нацыянальнай культуры ва ўмовах іншамоўнага асяроддзя.

**ЛЕПШЫЯ МЕМУАРЫ** — ***дзясяты том Збора твораў Максіма ТАНКА.*** Нават дзіўна, якой павучальнай і своечасовай кнігай могуць стаць дзённікі савецкага часу... Па-першае, іх можна разглядаць як сумную сямейную сагу пра росквіт і заняпад вялікай шчаслівай сям'і. Па-другое, з гэтага тома можна даведацца акалічнасці, у якіх адбываліся тыя ці іншыя літаратурныя падзеі мінулага. Ну і паглядзець на калег-пісьменнікаў вачыма чалавека, якога проста бессаромна выкарыстоўвалі для рашэння сваіх дробных утылітарных праблем... Але самае цікавае ў дзённіку — згадкі і палеміка са сваімі паплечнікамі і сябрамі, тымі, хто сёння па праву ўвахо-дзіць у пантэон нацыянальнай літаратуры. Напрыклад, чытачы могуць даведацца, што Максім Танк лічыў аўтарам культавай паэмы «Сказ пра Лысую гару» Міколу Аўрамчыка, зашыфраванага ў дзённіку як «М.А.».

**ЛЕПШАЯ КНІГА КРЫТЫКІ** — ***«Сыс і кулуары» Леаніда ГАЛУБОВІЧА.*** Апошнім часам ловіш сябе на думцы, што пра літаратуру цікавей чытаць, чым чытаць саму літаратуру. Цяжка не пагадзіцца з той ацэнкай, якую дае адзін з нашых самых аўтарытэтных крытыкаў стану сучаснай беларускай крытыкі: «Крытыка з д з я ц і н е л а і, як немаўлё, жэстам альбо крыкам спрабуе паказаць сваё ўспрыманне салодкага ці горкага (гэта смачнае, тое нясмачнае, гэта мастацкае, а тое не...) Даўно ўжо няма ўцямнага тлумачэння т а г о — мастацкага, на якое яна паказвае пальцамі, і няма прадчування і вызначэння новых творчых накірункаў». Варта адзначыць, што сёння гэтая кніга Галубовіча — ці не лепшы даведнік па актуальнай беларускай літаратуры.

**ЛЕПШАЯ КНІГА ГУТАРАК І ІНТЭРВ'Ю** — ***«З апокрыфа ў канон» Алеся РАЗАНАВА.*** Літаратурныя нататкі жывога класіка беларускай літаратуры не менш цікавыя за яго авангардную паэзію, хоць, зразумела, адрасаваныя яны спакушанай публіцы.

За год выйшла шмат цікавых і патрэбных кніг... І ўсё ж з сумам падсумую — выбар у нашага чытача, нягледзячы на вялікую колькасць выданняў, не такі і вялікі. І ўсё ж я не губляю надзеі, калі-небудзь прачытаць сваю і д э а л ь н у ю беларускамоўную кнігу.

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

## СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С | Я | Т | А | Р | А | Д | П | Р | Т | В |
| Н | Р | П | Ў | П | М | А | Л | Ы | С | А |
| І | Ч | А | Ш | Ч | Ы | Н | А | Е | М | С |
| А | К | К | А | Х | В | Я | Д | З | І | Ы |
| С | П | У | А | Р | Я | Б | А | Ц | К | Р |
| Ы | Н | І | К | А | С | У | К | В | І | А |
| Р | А | В | І | Н | П | П | Е | Н | Н | Д |
| В | Р | А | В | А | А | А | Р | В | Й | О |
| Ы | П | Б | А | Н | Д | А | Р | А | С | К |
| У | Р | Н | Е | Н | С | Н | О | Ж | Н | І |
| Ж | А | А | Р | Ы | С | Е | Ж | А | Н | Ь |

Гэтым разам пашукайце ў лабірынце пераклады слоў на беларускую мову. Колькасць літар пазначана ў дужках. Як звычайна, літары ў адказах сплятаюцца па гарызанталях (злева направа і справа налева) або па вертыкалях (зверху ўніз або знізу ўверх), але не па дыяганалях. Адно слова ў якасці прыкладу мы пазначылі.

**1.** Спичка (8). **2.** Толщина (8). **3.** Покупатель (8). **4.** Предприятие (13). **5.** Первая фаза Луны (8). **6.** Жертва (6). **7.** Ботва (8). **8.** Парное молоко (7). **9.** Сырьё (8). **10.** Купорос (8). **11.** Спутник (11). **12.** Декабрь (7). **13.** Испытание (12). **14.** Очерк (5). **15.** Роза (4).

**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД І ЛАБІРЫНТ**

**Па гарызанталі:** Гульня. Ныцот. Аўдыт. Мяс. Анжу. Ручаіна. Ліс. Ліцей. Ліра. Ліхтар. Ліцей. Ліра. Ліхтар. Ліцей. Ліра. Ліхтар